УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14 ВСЕСОЮЗНОЙ БИБЛИОТЕКИ ИМ. ЛЕНИНА
Всесоюзная библиотека имени Ленина
УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14 ВСЕСОЮЗНОЙ БИБЛИОТЕКИ ИМ. ЛЕНИНА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 66 (5740) | 21 сакавіка 1937 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Прыём іспанскіх пісьменнікаў Рафаэля Альберці і Марыі-Тэрэсы Леон таварышам СТАЛІНЫМ

Учора, 20 сакавіка, таварыш СТАЛІН прыняў для гутаркі іспанскіх пісьменнікаў Рафаэля АЛЬБЕРЦІ і Марыю-Тэрэсу ЛЕОН. Гутарка цягнулася дзве гадзіны.

АБ ЗНЯЦЦІ НЯДОІМАК ПА ЗЕРНАПАСТАЎКАХ ЗА 1936 г.

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

Зняць з калгасаў і аднаасобных гаспадарак па ўсіх абласцях, краях і рэспубліках нядоімкі, якія лічацца за імі па зернапастаўках 1936 г.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) І. СТАЛІН.

20 сакавіка 1937 г.

Аб абавязковых пастаўках зярна, рысу, сланечніка і бульбы дзяржаве ў 1937 годзе калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнымі гаспадаркамі і аб стаўках натураплаты работ МТС

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

I.

АБ АБАВЯЗКОВЫХ ПАСТАЎКАХ.

Захаваць па абавязковых пастаўках на 1937 год дзейнічаўшыя ў 1936 годзе нарадак, тэрміны і нормы здачы зярна, сланечніка, рысу і бульбы дзяржаве калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнымі гаспадаркамі, а таксама тэрміны зацвярджэння параённых норм здачы, з унясеннем пры гэтым наступных змен:

У змену пункта 16 пастановы Саўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) ад 19 студзеня 1933 года «Аб абавязковых пастаўках зярна дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі», забараніць прымяненне грашовых штрафаў па калгасаў, не выканаўшых ва ўстаноўленыя тэрміны сваіх абавязацельстваў па здачы зярна дзяржаве.

Устанавіць, што за злоснае невыкананне калгасам к установленаму тэрміну абавязацельстваў па здачы дзяржаве зярна пракурор вобласці (края, рэспублікі) па прадстаўленню раённага ўпаўнаважанага Камітэта загатовак прыцягвае праўленне калгаса да адказнасці па суду для налажэння грашовага штрафу ў размеры кошту нязданай часткі зярна, вылічанага па дзяржаўных закупачных цэнах, а таксама для спагнання натурай нявыкананай часткі паставак зярна.

Папырыць даную змену таксама на пастаўкі сланечніка, рысу і бульбы дзяржаве.

II.

ПА НАТУРАПЛАЦЕ РАБОТ МТС.

Знізіць існуючыя стаўкі натураплаты работ МТС, праведзеных ў калгасах пад ураджай 1937 года, і ўстанавіць па пералічаных ніжэй работах наступныя стаўкі натураплаты работ МТС:

па зернавых культурах і сланечніку (у кілаграмах):

	Ураджай з аднаго гектара (у цэнтнерах)						
	Менш 3 цнт.	3—менш 5.	5—менш 7.	7—менш 9.	9—менш 11.	11—менш 13.	13 і больш.
1. Веснавое ворыва	9	22	50	70	90	110	130
2. Ворыва папару і зябліва	8	20	42	60	80	100	120
3. Пасеў	2	4	8	12	16	20	25
4. Малацьба	7 процантаў ад колькасці зярна, намалочанага малатарнямі МТС.						
5. Баранаванне у адзін след.	0,5	1	1,5	2	3	4	5
6. Уборка камбайнамі	9,0 процантаў ад колькасці зярна, намалочанага камбайнамі.						
7. За правядзенне ўсяго комплекса асноўных с.-г. работ:							
а) пры абмалоце зярна малатарнямі (ворыва папару ці зябліва, пасеў, уборка, малацьба).	13	30	55	80	105	130	170
	і 7 процантаў ад зярна, намалочанага малатарнямі МТС.						
б) пры ўборцы зярна камбайнамі (ворыва папару ці зябліва, пасеў, уборка камбайнам).	9	20	37	54	71	88	128
	і 9,0 процантаў ад зярна, намалочанага камбайнамі МТС.						

Устанавіць, што за правядзенне другой, трэцяй і чацвертай культывацыі стаўкі натураплаты работ МТС, установленыя за правядзенне культывацыі, зніжаюцца: па другой культывацыі на 10 проц., па трэцяй культывацыі на 20 проц., па чацвертай культывацыі на 30 проц.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) І. СТАЛІН.

20 сакавіка 1937 года.

АБ НАЗНАЧЭННІ тав. БЕРМАНА Б. Д. НАРОДНЫМ КАМІСАРАМ УНУТРАНЫХ СПРАЎ БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

Назначыць таварыша Бермана Барыса Давідавіча народным камісарам унутраных спраў БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

20 сакавіка 1937 года.
г. Менск.

АБ ВЫЗВАЛЕННІ тав. МАЛЧАНАВА Г. А. АД АБАВЯЗКАЎ НАРОДНАГА КАМІСАРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

Вызваліць тав. Малчанава Георгія Андрэевіча ад абавязкаў народнага камісара ўнутраных спраў БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

20 сакавіка 1937 года.
г. Менск.

АБ ВЫНІКАХ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

Рэзалюцыя агульнагарадскога схода ленінградскага партактыва

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад тав. Жданава аб выніках чарговага Пленума ЦК ВКП(б), сход партактыва ленінградскай арганізацыі ў колькасці 2 тысячы чалавек поўнасцю ўхваляе рашэнні Пленума і заклікае ўсе партарганізацыі па-большэвіцку іх правесці ў жыццё.

Увядзенне новай Канстытуцыі СССР, якое азначае паварот у палітычным жыцці краіны, патрабуе, каб партыйныя арганізацыі ва ўсеўзбраенні сустрэлі гэты паварот і змаглі стаць на чале новых, да канца дэмакратычных выбараў.

«Для гэтага патрабуецца, каб партыя сама правяла паслядоўную дэмакратычную практыку, каб яна правяла да канца ва ўнутрыпартыйным жыцці асновы дэмакратычнага цэнтралізма, як гэтага патрабуе статут партыі, каб яна сама мела неабходныя ўмовы, у сілу якіх усе органы партыі з'яўляліся-б выбарнымі, каб крытыка і самакрытыка развіваліся ў поўнай меры, каб адказнасць партыйных органаў перад партыйнай масай была поўная і каб сама партыйная маса была поўнасцю актывізавана». (З рэзалюцыі Пленума ЦК ВКП(б).

Пленум ЦК ВКП(б) устанавіў грубае парушэнне многімі партарганізацыямі статута партыі і асноў унутрыпартыйнага дэмакратызма, шырокае распаўсюджванне нічым неапраўдваемай практыкі каптацыі ў первічныя органы, адсутнасць сістэматычнай справаздачнасці партыйных органаў перад членамі партыі, шматлікія выпадкі фактычнага назначэння сакратароў парткомаў вышэйстаячымі арганізацыямі.

Пленум ЦК з большэвіцкай рашучасцю ўскрыў буйныя недахопы ў рабоце парт-арганізацый, якія аслабляюць рэвалюцыйную пільнасць членаў партыі і партыйных работнікаў, культывуюць абрадушнасць і ратэйства, спрыяюць пранікненню трацкісцкіх і іншых двурушнікаў у партарганізацыі.

Частка партыйных кіраўнікоў, захапіўшыся гаспадарчым будаўніцтвам, стала адыходзіць ад партыйна-палітычнай работы, стала трапіць густ да ідэалагічнай работы, да работы па выхаванню партыйных і беспартыйных мас, стала трапіць густ да крытыкі нашых недахопаў і самакрытыкі, пачала адыходзіць ад прамой адказнасці перад партыйнымі масамі, парушаць выбарнасць партыйных органаў, парушаць большэвіцкі падыход да падбору і размеркаванню кадраў, перастала праяўляць належную ўвагу да людзей, да членаў партыі, да работнікаў.

Гэтыя сур'ёзныя недахопы ў партыйнай рабоце, дазволіўшыя трацкісцкім і іншым двурушнікам ашукваць партыйных кіраўнікоў і праводзіць беспакарана падрыўную работу супроць партыі і савецкай дзяржавы, паказваюць, што многія партыйныя арганізацыі і іх кіраўнікі, наперакор неаднаразовым указаниям ЦК аб павышэнні рэвалюцыйнай пільнасці, усё яшчэ не пакончылі з ілюёнкай хваробай самазаспакоенасці, апартуністычнай дабрадушнасці і бестурботнасці.

Многія партыйныя работнікі забыліся, што па меры росту нашых поспехаў узмацняецца шалёнае азлабленне ворагаў сацыялізма і распе іх супраціўленне, забыліся аб існаванні капіталістычнага акружэння, якое засылае і будзе засылаць да нас шпіёнаў, дыверсантаў, праглядзелі той факт, што трацкізм, ужо даўно перастаўшы быць палітычнай плынню ў рабочым руху, ператварыўся ў наёмную банду азвярэлых забойц, дыверсантаў, шпіёнаў і шкоднікаў на службе ў буржуазіі.

Сход ленінградскага актыва ўхваляе рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні Бухарына і Рыкава з радоў ВКП(б) за антыпартыйную зрадніцкую дзейнасць, накіраваную на аднаўленне ў нашай краіне капіталізма.

Агульнагарадскі сход ленінградскага партыйнага актыва падкрэслівае, што парушэнне статута партыі і буйныя недахопы партыйнай работы, адзначаныя ў рашэннях ЦК, маюць пашырэнне і ў нашай ленінградскай партарганізацыі.

У первічных партарганізацыях, у Краснітанскім і Маскоўскім райкомах атрымала значныя размеры недапушчальная практыка каптацыі. У склад самога гарадскога камітэта таксама каптавана 7 чалавек.

Парткомы первічных партарганізацый у сваёй большасці, а таксама райкомы ужо на працяту больш чым трох год не адчываліся перад членамі партыі; ва многіх выпадках як у первічных партарганізацыях, так і ў райкомах партыйныя сходы, пасяджэнні пленумаў РК, актыва праходзяць у абстаноўцы адсутнасці большэвіцкай самакрытыкі, у небольшэвіцкай і шкоднай атмасферы параднасці, шуміхі, усхвалення па адрасу партыйных кіраўнікоў. Пленумы раённых камітэтаў мала абмяркоўваюць важнейшыя пытанні партыйна-палітычнай работы і справаздачы партарганізацый.

Пленум гарадскога камітэта збіраецца рэдка, у яго рабоце недастатковае месца займалі пытанні партыйна-палітычнай работы.

Сход партактыва лічыць, што райкомы і гарадскі камітэт не зрабілі неабходных вываадаў з указанняў ЦК ВКП(б) аб выпраўленні памылак, дапушчаных у часе праверкі і абмену партдакументаў у адносінах выключаных з радоў партыі за касіўнасць, і адзначае вялікую колькасць фактаў няўважлівых адносін да членаў партыі, у асаблівасці па Куйбышэўскаму і Кіраўскаму райкомах.

Сход партактыва асуджае практыку ведаўшчыні ідэалагічна-прапагандысцкага фронта і друкаванага слова і патрабуе ад партыйных кіраўнікоў аднаўлення значэння справы палітычай агітацыі, друку і прапаганды ленінізма, сапраўднага ведання агітатараў і прапагандыстаў, сістэматычнай праверкі іх на рабоце.

Сход актыва зварачае асаблівую ўвагу ўсіх партарганізацый на выключную важнасць палітычнай агітацыі ва ўмовах новай Канстытуцыі і лічыць нездавальняючым становішча палітычнай агітацыі ў гарадской арганізацыі. Асабліва нездавальняюча работа ў галіне палітычнай агітацыі і прапаганды ў Васілеастраўскім, Выбаргскім, Свердлоўскім і Смольнінскім раёнах.

Сход актыва патрабуе ад усіх гаспадарчых кіраўнікоў і ўсіх партыйных арганізацый сур'ёзнага большэвіцкага ўсваення ўрокаў шкодніцтва, дыверсіі і шпіянажа японска-нямецка-трацкісцкіх агентаў і іх правых саўдзельнікаў, бдзявой мабілізацыі ўсіх членаў партыі, усіх рабочых, інжынераў і тэхнікаў на хутчэйшую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва.

Сход актыва падкрэслівае выключную важнасць баявога палітычнага выхавання кадраў для паспяховага выраўнання задач, якія стаяць перад намі.

Падкаваць практычных работнікаў ідэалагічна, зрабіць іх сапраўднымі марксістамі-ленінцамі, здольнымі правільна разбірацца ва ўнутранай і міжнароднай абстаноўцы — гэта значыць выраўнаць дзевяць дзесятых усіх нашых задач.

Лозунг авалодання тэхнікай павінен быць дапоўнен лозунгам авалодання большэвізмам.

Наступаючыя выбары кіруючых парторганаў павінны быць праведзены пад знакам смелай большэвіцкай самакрытыкі недахопаў партыйнай работы, выкрыцця негодных, адарваўшыхся ад мас кіраўнікоў, вылучэння ў партыйныя органы лепшых, адданых партыі большэвікоў.

Сход актыва падкрэслівае выключна высокія патрабаванні, якія прад'яўляюцца ў сучасны момант партыйным кіраўнікам, і абавязвае іх перабудаваць усю партыйна-палітычную работу і практыку кіраўніцтва ў строгай адпаведнасці з рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б).

Кіраваць у даных умовах — гэта значыць быць моцна ўзброеным ленінізмам, быць палітычна празорлівым і па-большэвіцку пільным не на словах, а на справе, не захапляцца поспехамі, і ніколі не адрывацца самазаспакоенасці, не забываць ні на мінуту аб капіталістычным акружэнні, аб тым, што буржуазныя дзяржавы, якія нас акружаюць, вядуць беспарадпынна падрыўную работу супроць краіны соцыялізма, засылалі і будуць засылаць у нашу краіну шпіёнаў, шкоднікаў, дыверсантаў, што трацкісцкія і іншыя двурушнікі сталі наёмнай бандай фашысцкіх забойцаў, шпіёнаў і шкоднікаў, якія знаходзяцца на службе замежных разведак.

Трэба клапаціцца аб тым, каб кадры работнікаў безупынна ўдасканальваліся ў веданні ленінізма, бо палітычная падкаванасць нашых работнікаў—галоўная і рашаючая ўмова паспяховай барацьбы з класавым ворагам.

Кіраваць у даны час—гэта значыць быць цесна і непарыўна звязаным з працоўнымі, быць чулым да сігналаў, якія ідуць ад радавых работнікаў, умець не толькі вучыць масы, але і вучыцца ў мас, смела развіваць большэвіцкую крытыку і самакрытыку недахопаў работы тых або іншых кіраўнікоў, «не зважаючы на асобы».

Кіраваць у даных умовах—гэта значыць па-большэвіцку падбіраць і выхоўваць кадры, кіраваць ў падборы кадраў выключна палітычнымі і дзелавымі якасцямі вылучаемых работнікаў, адкідаючы небольшэвіцкі, антыпартыйны падыход да вызначэння на работу па адзнаках сямейнасці, арцельнасці, патурання «сваім» людзям.

Кіраваць цяпер—гэта значыць арганізаваць сістэматычную, штодзённую праверку кадраў па іх рабоце, злучаючы праверку зверху з праверкай знізу праз партыйныя і беспартыйныя актывы, праз дзелавыя справаздачы, праз выбары. Гэта значыць—выхоўваць і навучаць кадры работнікаў на іх уласных памылках, ніколі не змазваючы дапушчаных памылак, памятаючы аб тым, што змазванне памылак губіць кадры.

Па-большэвіцку кіраваць работай гаспадарчых органаў—гэта значыць ажыццяўляць кіраўніцтва гаспадаркай праз гаспадарчыя органы, а не паміма іх, аказваць дапамогу, умацоўваць іх кадрамі.

Кіраваць у даных умовах—гэта значыць праяўляць максімальную чуласць да членаў партыі, да работнікаў, не дапускаючы агульнага, неіндывідуальнага падыходу да іх.

Сход партактыва ленінградскай арганізацыі заклікае ўсіх членаў арганізацыі ўважліва і глыбока вывучаць рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), якія з'яўляюцца баявой праграмай перабудовы работы ўсіх арганізацый.

Мы абавязаны зрабіць усё для таго, каб на аснове ажыццяўлення рашэнняў Пленума ЦК выгнаць дабрадушнасць з нашых радоў, ва ўсім і ўсюды арганізаваць большэвіцкую пільнасць.

Нам, ленінградскім большэвікам, якія працуюць на выключна адказным посту, рэвалюцыйная пільнасць — шляхавадная зорка для усіх большэвікоў — асабліва неабходна.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта нашай партыі згуртаванымі радамі, натхнёныя рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б), наперад, да новых перамог!

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б У СУВЯЗІ З АРТЫКУЛАМ „ПРАВДЫ" АД 19 САКАВІКА 1937 ГОДА ПАД ЗАГАЛОЎКАМ „ШКОДНАЯ СТРАПНЯ"

1. Бюро ЦК КП(б)Б прызнае правільнай даную ў артыкуле «Правды» ад 19 сакавіка 1937 года крытыку перадавіцы «Звязды» ад 8 лютага 1937 года, прысвечанай вынікам Пленума ЦК КП(б)Б.

2. Перадавы артыкул «Звязды», які робіць вывад аб тым, што «нанесен сур'ёзны ўдар расхлябанасці і падхалімству, пароджаным спецыфічнымі ўмовамі жыцця беларускага і яўрэйскага народу ў мінулым, местачковасцю», — з'яўляецца палітычна шкодным, скажаючым ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, і, як зусім правільна ўказвае «Правда», паклёпам на беларускі і яўрэйскі народы.

Гэты перадавы артыкул газеты «Звязда» культывуе варожыя большэвізму і асуджаныя партыяй падхалімства і ўгодніцтва, якія, як правільна ўказвае «Правда», глыбока ўмацаваліся ў беларускай партыйнай арганізацыі.

3. Бюро ЦК адзначае, што апрача гэтых выкрытых «Правдой» памылак, газетай «Звязда» на працягу апошняга перыяда (снежань 1936 — сакавік 1937 гг.) быў дапушчан і рад іншых палітычных памылак.

4. Бюро ЦК КП(б)Б прызнае сваёй памылкай, што яно своечасова не выправіла гэтых грубых палітычных памылак, дапушчаных рэдакцыяй «Звязды», і не арганізавала барацьбы з падхалімствам і ўгодніцтвам у КП(б)Б.

5. Прыняць да ведама заяву рэдактара газеты «Звязда» тав. Юркова аб тым, што ён прызнае дапушчаныя ім палітычныя памылкі. Указаць т. Юркову і папярэдзіць яго, што ў выпадку паўтарэння ў яго далейшай рабоце палітычных памылак да яго будуць ужыты суровыя меры партыйнага спагнання.

6. Даручыць Адзелу друку і вылавецтваў ЦК КП(б)Б у бліжэйшы час прадставіць на разгляд бюро ЦК свае прапановы аб умацаванні работнікамі рэдакцыі газеты «Звязда».

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Падхалімства—метад класавага ворага

Сёння мы публікуем пастанову Бюро ЦК КП(б)Б у сувязі з аглядам «Правды» ад 19 сакавіка 1937 года пад загалоўкам «Шкодная страпня». У гэтым рашэнні з усёй яснасцю выкрываюцца грубыя палітычныя памылкі «Звязды», дапушчаныя ёй у перадавой, апублікаванай 8 лютага, і іншых матэрыялах.

Вывад перадавой «Звязды» ад 8 лютага аб тым, што «нанесен сур'ёзны ўдар расхлябанасці і падхалімству, народжаным спецыфічнымі ўмовамі жыцця беларускага і яўрэйскага народаў у мінулым, местачковасцю», змяшчае ў сабе грубыя палітычныя памылкі і з'яўляецца паклёпам на беларускі і яўрэйскі народы.

Паклёпніцкі ў адносінах да беларускага і яўрэйскага народаў характар гэтага выводу перадавой «Звязды» зусім відавочны і не патрабуе доказаў. Ён супярэчыць асновам ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі і неаднаразовым выказваннням вялікага Сталіна аб беларускім народзе, як гераічным і рэвалюцыйным народзе, які не толькі прагнаў сваіх прыгнятальнікаў, але і пабудаваў соцыялізм; зусім правільна «Правда» кваліфікуе погляд, выказаны ў перадавой «Звязды» ад 8 лютага, як перанясенне «тэорыі» Бухарына «аб нацыі Абломавых» на беларускі і яўрэйскі народы, «тэорыі» паклёпніцкай, нічога агульнага не маючай з марксізмам і даўно разгромленай нашай партыяй.

КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт пагэтаму рашуча асудзілі гэту грубую палітычную памылку, дапушчаную рэдактарам «Звязды». У сваёй пастанове Бюро ЦК КП(б)Б прама ўказала, што «вывад перадавой «Звязды» «з'яўляецца палітычна шкодным, скажаючым ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку і, як зусім правільна ўказвае «Правда», паклёпам на беларускі і яўрэйскі народы».

Зусім няправільна і шкодна тлумачэнне карэнняў падхалімства, якое дана ў той-жа перадавой. У сапраўднасці падхалімства, якое, як зусім правільна ўказана ў агляде «Правды», укаранілася ў КП(б)Б, тлумачыцца не ўмовамі жыцця народу ў мінулым, г. зн. не аб'ектыўнымі ўмовамі. ЦК ВКП(б) у сваіх пастановах аб Азова-Чорнаморскім краі і Кіеўскай вобласці ўскрыў сапраўдныя прычыны гэтага з'явішча. Падхалімства—метад барацьбы класавага ворага супроць комуністычнай партыі, супроць соцыялізма. Вораг карыстаўся гэтай зброяй для ўсыплення пільнасці. Усхваленне кіраўнікоў партыйных і савецкіх органаў края, вобласці, рэспублікі стварала самазаспакоенасць, благадушша, якія тармазілі разгортванне большэвіцкай самакрытыкі і выкрыццё наглай банды трацкістаў, правых і іншых ворагаў народу.

Гэты метад вораг цалкам выкарыстаў і ў БССР. Шумныя парады, усхваленне кіруючых работнікаў рэспублікі і раёнаў, абвалакванне асобных комуністаў палягчала работу ворага, бо давала яму магчымасць лепш ўкрыцца. «Звязда» не толькі не змагалася супроць падхалімства, але і сама ўдзельнічала ва ўсхваленні кіруючых работнікаў рэспублікі, ствараючы атмасферу шуміхі, параднасці, благадушша і самазаспакоенасці. У перадавой, прысвечанай вынікам пленума ЦК КП(б)Б, адбыўшагася ў канцы студзеня 1937 года, «Звязда» не толькі не абрушылася супроць падхалімства, але працягвала ўсхваленне кіруючых работнікаў рэспублікі, даўшы пры гэтым няправільную, дэзарыентуючую партыйную арганізацыю ўстаноўку аб тым, што быццам у Беларусі падхалімству нанесен сур'ёзны ўдар. Гэта апэка не толькі не настарожвала партыйную арганізацыю, не толькі не заклікала да барацьбы з падхалімствам, як метадам, які дазваляе ворагу лепш укрывацца, але, наадварот, заспакойвала партыйную арганізацыю. ЦК КП(б)Б рашуча асудзіў гэту ўстаноўку, як шкодную, якая не садзейнічае развіццю самакрытыкі.

«Гэты перадавы артыкул газеты «Звязда», — гаворыцца ў пастанове, — культывуе варожыя большэвізму і асуджаныя партыяй падхалімства і ўгодніцтва, якія, як правільна ўказвае «Правда», глыбока ўмацаваліся ў беларускай партыйнай арганізацыі.

3. Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што апрача гэтых выкрытых «Правдой» памылак, газетай «Звязда» на працягу апошняга перыяда (снежань 1936 года—сакавік 1937 года) быў дапушчан і рад іншых палітычных памылак.

4. Бюро ЦК КП(б)Б прызнае сваёй памылкай, што яно своечасова не выправіла гэтых грубых палітычных памылак, дапушчаных рэдакцыяй «Звязды», і не арганізавала барацьбы з падхалімствам і ўгодніцтвам у КП(б)Б.

5. Прыняць да ведама заяву рэдактара газеты «Звязда» тав. Юркова аб тым, што ён прызнае дапушчаныя ім палітычныя памылкі. Указаць тав. Юркову і папярэдзіць яго, што ў выпадку паўтарэння ў яго далейшай рабоце палітычных памылак да яго будуць ужыты суровыя меры партыйнага спагнання».

Соцыялізм у СССР перамог канчаткова і беспаваротна. Але перамог ён толькі на адной шостай частцы зямнага шара. Таму класавая барацьба не ўціхае, як некаторыя думаюць, а ідзе ў жорсткай форме. Капіталістычны свет накіроўвае сваю агентуру ў СССР. Гэтага ніколі нельга забываць членам КП(б)Б, працуючым у рэспубліцы, якая мяжуецца з капіталістычным Захадам.

Вораг арудуе на радзе прадпрыемстваў, калгасаў і соўгасаў. Ён пралязае ў савецкі і нават партыйны апарат, ён моцна шкодзіў нам на чыгунках, размешчаных на тэрыторыі БССР. Нядаўна раскрыта варожая група на водным транспарце ў Гомелі. Апублікаваныя ў «Звяздзе» сігналы гавораць аб тым, што вораг дзейнічае ў школах і іншых навучальных установах. Ён пралязае ўсюды, дзе ёсць благадушша і самазаспакоенасць. Падхалімства — зброя ворага для барацьбы з партыяй. Падхалімства стварае благадушша і самазаспакоенасць, яно тармозіць разгортванне большэвіцкай самакрытыкі. Там, дзе падхалімства не выкарчавана, там няма і не можа быць сапраўднай большэвіцкай самакрытыкі, там непазбежна тармозіцца рост актыўнасці партыйных мас, паслабляецца ўзброенасць іх у барацьбе з ворагам, а значыцца, гатоўнасць комуністаў стаць на чале павароту, які адбыўся ў краіне ў сувязі з прыняццем Сталінскай Канстытуцыі. Вось чаму агонь большэвіцкай самакрытыкі трэба накіраваць супроць падхалімства, выкрываючы канкрэтных носьбітаў і арганізатараў парадняснасці і шуміхі, усхвалення кіруючых работнікаў і абвалакванння іх.

КП(б)Б, моцная рэвалюцыйнымі традыцыямі свайго народу, выгнаўшага сваіх эксплаататараў і пабудаваўшага соцыялізм, народу, роўнага сярод роўных у магутным Совецкім Саюзе, выкарчуе падхалімства. Члены КП(б)Б, узброеныя сталінскімі дакументамі — пастановамі пленума ЦК ВКП(б), — падняўшы сцяг большэвіцкай самакрытыкі, сарвуць маску з класавага ворага і ўстануць на чале павароту, які ўтварыўся ў краіне.

ПАЧАЛІСЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ

ПЕТРЫКАЎ. (Кар. «Звязды»). На Палессі стаяць цёплыя, сонечныя дні Веснавой прахладай вее з ракі Прыпяць. Пухкі лёд адзелен ад берагоў і гатоў вось-вось зусім растаяць. Вясна адчуваецца і на палях. Снег зусім растаяў, і вільготная зямля награецца пад праменнямі веснавога сонца. На больш узвышаных мясцах пачалі веснавыя работы.

У некаторых сельсоветах Петрыкаўскага раёна аратыя вышлі ў поле. 19 сакавіка тры брыгады калгаса імя 1 мая Макаравіцкага сельсовета выехалі араць. На 15 двухнарных плугах яны ўзаралі 9,4 гектара. У гэты-ж дзень у калгасе «Ленінскі шлях» гэтага-ж сельсовета ўзарана 7 гектараў.

Н. ГАСМАН.

КАЛГАСНЫЯ ДРАМГУРТКІ

«Сёння (следуе чысло і месяц) у Доме соцкультуры сіламі калгаснага драмгуртка дан будзе спектакль. Пастаўлена будзе п'еса» (следуе назва п'есы і прозвішча аўтара)... Такія афішы ў вёсны Браніслаўль, Жыткавіцкага раёна з'яўляюцца вельмі часта. Калгасны драмгурток існуе тут ужо два гады. За гэты час ім пастаўлена на сцэне Дома соцкультуры каля 50 спектакляў. Пастаноўкі гуртка карыстаюцца вялікім поспехам. Славіцца браніслаўскі драмгурток і па-за сваім калгасам. Яго пастаноўкі не адзін раз глядзелі калгаснікі суседніх калгасаў — імя Дзержынскага і «Чырвоны памежнік».

Рэпертуар гуртка вельмі разнастайны. Ён ставіць невялікія інсцэніроўкі і нават вялікія п'есы — драмы, трагедыі і камедыі.

Нядаўна гурток ставіў сваімі сіламі п'есу «Платон Крэчэт». Асноўныя ролі ў гэтай п'есе выконвалі калгаснік Асадчук Даніла, калгасніцы Флор'яновіч Маша, Дудзіч Поля, Гарбар Соня.

Апрача пастановак спектакляў, драмгурток часта сваімі сіламі наладжвае канцэрты. Праграма канцэртаў складаецца з джаз-аркестра, групавых і індывідуальных спеваў і танцаў, выступленняў расказчыкаў і чытальнікаў-дэкламатараў.

Браніслаўскі драмгурток (калгас «Прамень комуны») у Жыткавіцкім раёне не адзіны. Пагранічны калгас «Чырвоны памежнік» таксама славіцца ў раёне добрай самадзейнасцю. Асноўнае месца ў ёй належыць драмгуртку, які складаецца з 18 калгаснікаў, працуючых непасрэдна на вытворчасці. Найактыўнейшымі ўдзельнікамі пастановак драмгуртка з'яўляюцца калгаснікі Кулыкевіч Саўка, Круц Іван, Савіцкі Андрэй і калгасніцы Канонік Марыя, Зайда Дуня і Швец Рая.

Такія дадатныя бакі работы двух калгасных драмгурткоў. Але трэба сказаць і аб іх недахопах, тым больш, што яны залежаць не столькі ад саміх гурткоў, колькі ад кіраўніцтва імі з боку культурна-асветных устаноў.

Галоўны недахоп у рабоце абодвух драмгурткоў — гэта адсутнасць большмені кваліфікаваных кіраўнікоў, без якіх пры рабоце над новымі п'есамі адчуваюцца вялікія цяжкасці.

— Кіраваць гуртком я кірую, але, сказаць вам па праўдзе, сам мала чаго разумею ў гэтай справе, — прызнаецца т. Краўчук (браніслаўскі гурток).

Такія заявы можна пачуць ад многіх кіраўнікоў калгасных драмгурткоў. Адвэтуль трэба зрабіць вывад: настаў час сур'ёзна заняцца падрыхтоўкай кіраўнікоў калгаснай самадзейнасці, якая так бурна зараз развіваецца. Трэба неадкладна прыступіць да арганізацыі кароткатэрміновых курсаў кіраўнікоў калгасных гурткоў самадзейнасці.

У Жыткавічах такія курсы будзе праводзіць культпроп райкома КП(б)Б. На іх будзе займацца 30 чалавек.

Аднак якасная работа гэтых курсаў будзе невысокая, бо ў раённым цэнтры няма добрых спецыялістаў тэатральнай справы. У сувязі з гэтым паўстае пытанне — чаму не арганізаваць справу так, каб для выкладання на такіх курсах прыцягнуць спецыялістаў буйнейшых гарадоў БССР: Менска, Гомеля, Магілева і інш.?

Другім вялікім недахопам у рабоце калгасных драмгурткоў з'яўляецца адсутнасць адпаведных дэкарацый, касцюмаў і грыма.

Гэта акалічнасць таксама патрабуе ўзмацнення ўвагі да работы калгасных драмгурткоў.

Ф. РЫГОРАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ. Запрашаем работнікаў мастацтва выказацца на старонках «Звязды» па сутнасці ўзнятых у гэтым артыкуле пытанняў.

На Заходняй граніцы СССР. Фотаэцюд С. Грына і В. Лейна.

ПАТУРАЮЦЬ БРАКАРОБАМ

Н-ская батарэя артылерыйскай школы купіла на магілеўскай фабрыцы **«Чырвоны мэбельшчык»** два дываны за 450 рублёў.

Дзяжурны назаўтра ўжо дакладваў камандзіру: «У батарэі нічога не здарылася за выключэннем таго, што дываны праваліліся». Камандзір батарэі адразу-ж паведаміў дырэктару фабрыкі тав. Кагану, што дываны бракаваныя. Дырэктар папрасіў прывезці іх назад на фабрыку і абяцаў расшукаць бракаробаў. Але ні дырэктар Каган, ні загадчык вытворчасці Зісман не пацікавіліся, хто з'яўляецца бракаробам на фабрыцы.

Калі дываны пасля рамонту былі гатовы, камандзіру батарэі прапанавалі заплаціць за рамонт 56 руб. І толькі пасля ўмяшання ў гэту справу райкома партыі дываны былі звернуты без аплаты за рамонт.

Палітрук батарэі КУТАЦЕЛАЎ.

НЕЗАКОННА ВЫКЛЮЧЫЛІ З КАЛГАСА

За тое, што мой муж Санцэвіч В. А. пайшоў на пабочныя заработкі, мяне выключылі з калгаса «Чырвоны сцяг», Валокскага сельсавета, Хойніцкага раёна.

Мне 50 год. Я выпрацавала ў мінулым годзе 183 працадні. Працавала ў калгасе добрасумленна. Лічу, што мяне выключылі беспадстаўна.

Аб няправільным выключэнні я абскардзіла ў райвыканком на імя тав. Марчанкі, але на працягу трох месяцаў мая заява не разглядаецца.

Н. І. САНЦЭВІЧ.

МАИСТАР-ХАБАРНІК

Начальнік цэха віцебскай люстэркавай фабрыкі Левін унаследаваў усе адмоўныя якасці майстра дарэволюцыйнага часу.

Хабары з заказчыкаў і з сваіх-жа рабочых — звычайная справа ў Левіна.

Нядаўна на фабрыку быў перадан заказ смаленскай люстэркавай арцелі. За выкананне гэтага заказу ў тэрмін Левін узяў з прадстаўніка арцелі хабар у 150 руб.

Прадстаўніку менскай люстэркавай фабрыкі Левін за хабар выдаў 2 скрыні пемзы.

Левін нічым не ганьбуе, нават ашуканствам сваіх-жа рабочых. Рабочы Каралькоў рабіў шліфоўку камня. За гэта Левін выплаціў яму 28 руб. Фактычна за гэту работу ён выпісаў 60 руб. Астачу начальнік цэха паклаў сабе ў кішэню.

Левіну ўсё сходзіць з рук, бо крытыка і самакрытыка на фабрыцы ў загоне.

ШТЭЙМАН.

АРГАНІЗАВАЦЬ АДПАЧЫНАК МОЛАДЗІ

На заводзе імя Кірава (Менск) працуе звыш тысячы рабочых, сярод якіх многа комсамольскай і беспартыйнай моладзі. Аднак культурны адпачынак рабочых зусім не арганізован. Заводскі і комсамольскі камітэты не ведаюць, як моладзь праводзіць свой вольны час.

Старшыня заўкома тав. Лапідус нядаўна заявіў, што наш завод будзе абслугоўваць клуб металістаў. На справе-ж, калі ў клубе металістаў арганізоўваецца вечар або даклад, рабочых нашага завода туды не прапускаюць. Так здарылася, напрыклад, у канцы снежня, калі ў клубе выступаў з дакладам герой Совецкага Саюза тав. Слепнёў. Моладзь нашага завода асталася за дзвярыма.

ГІНЗБУРГ, ШМУЙЛОВІЧ, ХАНКЕВІЧ.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

ПОЛАЦК. 3 мая 1936 года на станцыі Дрэтунь валяецца пад адкрытым небам 50 тысяч асінавых клёпак на суму ў 10 тыс. рублёў. За летні час іх расцягнулі цэлы вагон. Бралі ўсе, каму толькі ўзідумаецца.

Полацкі хімлессаюз (дырэктар Эзерын) — гаспадар гэтай прадукцыі—купляў гатовыя бочкі ў арцелі «Праца» і пераплачваў па 13 руб. за штуку, у той час, як свая клёпка ляжала пад дажджом. Наогул саюз за апошнія гады меў 20 тыс. рублёў страт.

Гужавы транспарт зусім разваліўся. Толькі за 1936 год пала трое коней. Прараб Макарэвіч атрымліваў грошы на корм, але-ж выдаткоўваў іх на іншыя патрэбы, а каня не карміў. Да пачатку сезона хімлессаюз астаўся без коней. Новая грузавая аўтамашына разбіта і патрабуе капітальнага рамонту. Аднак ніхто нават не думае адрамантаваць яе. Прараб Макарэвіч растраціў 2400 рублёў. Дырэктар Эзерын замяў гэту справу.

Белкалесправмсаюзу патрэбна вызваліцца ад такіх «гаспадарнікаў».

БАНКАВЕЦ.

БЕСПРЫТУЛЬНЫ ЗАВОД

У некалькіх кіламетрах ад м. Талачыно пры соўгасе «Гарчэўшчына» знаходзіцца цагельны завод, які выпускае пустацельную цэглу. Не гледзячы на тое, што патрэбнасць калгасаў у цэгле расце, завод працуе з перабоямі.

Калі рабочыя ставілі пытанне перад дырэктарам соўгаса тав. Кудзінавым аб прыняцці адпаведных мер да павышэння прадукцыйнасці працы і якасці, выпуску новай прадукцыі-чарапіцы (у паўтара кіламетрах ад завода знаходзіцца торфбалота Крыўлянскае), то ён адказаў:

Цагельны завод ніякай карысці не дае, яго трэба закрыць..

Па нашай думцы, дзеянні дырэктара соўгаса з'яўляюцца няправільнымі.

СУБОРАЎ,
рабочы цагельнага завода пры соўгасе «Гарчэўшчына», Талачынскага раёна.

Каштоўнейшае вынаходніцтва ў цвікавай прамысловасці

Найбольш распаўсюджанымі варштатамі ў цвікавай прамысловасці Совецкага Саюза да гэтага часу з'яўляюцца варштаты «Малмедзі», прасцейшага тыпу, не быстраходныя, працуючыя на крыўляных пружынах, так званых «хлапушках». Прадукцыйнасць гэтых варштатаў процантаў на 40 ніжэй прадукцыйнасці быстраходных варштатаў «Нацыянал» і «Малмедзі-прэс» пры рабоце на адпаведным асартыменце.

На працягу каля дзесятка год тэхнічная мысль працуе над пытаннем павышэння прадукцыйнасці варштатаў «Малмедзі». Магчымасць павелічэння колькасці абаротаў варштата выключана і таму ўсе спробы рабіліся ў напрамку асваення працэсу адначасовай рубкі двух цвікоў, г. зн. замест падачы ў механізм варштата адной ніці дроту адразу двух. Усе гэтыя спробы не давалі рэальных рэзультатаў і былі закінуты.

У апошні час, наглядаючы за работай варштатаў, у пошуках спосабу павелічэння іх прадукцыйнасці мы на заводзе прышлі к выводу, што працэс адначасовай падачы ў механізм двух ніцей дроту і рубкі двух цвікоў зусім магчымы. Для гэтага мы прыступілі да пераканструявання падаючага механізма. Замест аднаго падаючага зубіла мы ўстанавілі два. Пераканструявалі клупікі — нажавічныя і плашкавыя, у якіх знайшлі гнёзды для рэжучага інструменту і рэгулюючых балтоў. Адпаведна гэтаму змянен штэмпель і камні (акенца для праходу дроту). Правільныя ролікі пераканструяваны на два ручаі.

Усё гэта зроблена на заводзе сваімі сіламі ў сваіх майстэрнях. Расходы на ўсе работы зусім нязначныя — прыблізна 300—400 рублёў.

16 сакавіка завод прыступіў да выпрабавання варштата пасля рэканструкцыі. Першы дзень работы паказаў, што вопыт удаўся поўнасцю. Працуючы на асартыменце цвікоў 2,6×70 міліметраў, варштат да рэканструкцыі даваў у змену 203 кілаграмы цвікоў, 16 сакавіка, г. зн. пры выпрабаванні, ён за 6 гадзін пасек 300 кілаграм цвікоў. Якасць цвікоў здавальняючая.

Пяпер завод працуе над знішчэннем выяўленых дэфектаў і найбольш дакладным вырабам інструментаў. Паўторнае выпрабаванне, праведзенае 18 сакавіка, паказала, што варштат пры нармальнай рабоце дасць прырост прадукцыйнасці прыблізна на 70 проц.

Улічваючы распаўсюджанасць варштатаў тыпу «Малмедзі» на нашых заводах, вынаходніцтва, зробленае на нашым заводзе, рэалізацыя якога не патрабуе вялікіх затрат і можа быць зроблена на любым заводзе, набывае выключна вялікае значэнне. Гэта, па-першае, аслабяе цікавую прамысловасць ад імпарту варштатаў, па-другое, амаль падвайвае выпуск прадукцыі на існуючым абсталяванні, патаняе сабекошт цвікоў.

У бліжэйшы час наш завод прыступае да такой-жа рэканструкцыі ўсіх сваіх варштатаў. Рэалізацыя гэтага вынаходніцтва ў агульназаводскім маштабе выклікае неабходнасць рэканструкцыі дротавага цэха, які падрыхтоўвае поўфабрыкат для цвікавых варштатаў. Інакш можа атрымацца разрыў паміж прадукцыйнасцю дротавага цэха і цвікавага і немінучая недагрузка цвікавых варштатаў.

Каб уникнуць гэтага, мы прыступілі да замены валачыльных барабанаў старога тыпу на барабаны «Гроппуг» з хуткасцю валачэння ў 100 метраў у мінуту замест 72. Для павелічэння каэфіцыента выкарыстання валачыльных барабанаў намі падрыхтоўваецца пераход на стыкавую электразварку дроту.

Валачыльныя барабаны новага тыпу па сваёй канструкцыі найбольш бесапасныя. Запражкі барабана праводзяцца не ў рабочым стане, а шляхам закладкі ва ўнутраныя кляшчы барабана адцягнутага канца даўжынёю 0,4—0,5 метра на адпаўжным апараце, устаноўленым пры кожным барабане. Апрача гэтага, барабаны новага тыпу значна аблягчаюць працу валачыльшчыкаў.

Другім буйным мерапрыемствам, якое мы праводзім на нашым заводзе, з'яўляецца асваенне вырабу сіламі завода шурупных аўтаматаў як па нарэзцы, так і па абточцы. Шурупныя аўтаматы да гэтага часу вырабляюцца толькі за граніцай, і Совецкі Саюз штогодна расходуе значныя сумы валютных сродкаў для імпарту гэтых аўтаматаў.

Шурупныя аўтаматы намі карэнным чынам рэканструююцца. Так, каратка ўзята на цэнтрах, што падаўжае тэрмін работы данай карэткі. Эксцэнтрык, які закрывае і адкрывае патрон, заменен прасцейшай канструкцыяй і замест бронзы робіцца з чыгуну з устаўным камнем. Набор шасцёрань, вызначаючых крок разьбы, сканструяваны ў адпаведнасці са стандартам.

Два аўтаматы па нарэзцы, зробленыя ў вопытным парадку на заводзе, ужо ўстаноўлены і працуюць. Па якасці сваёй работы яны не ўступаюць імпартным аўтаматам. Пяпер у зборцы знаходзяцца 4 аўтаматы, з якіх 2 будуць зданы ў эксплаатацыю ў першай палове красавіка гэтага года.

Масавы выпуск аўтаматаў затрымліваецца з-за адсутнасці на заводзе неабходнай колькасці абсталявання, як токарных і фрэзерных варштатаў. Маючы гэта абсталяванне, завод меў-бы поўную магчымасць павялічыць лік аўтаматаў і расшырыць вытворчасць шурупаў — гэтай востраэфіцытнай прадукцыі.

Апрача таго, наш вопыт можа быць выкарыстан станкабудаўнічымі заводамі, якія маглі-б прыступіць да серыйнага выпуску аўтаматаў гэтага тыпу і канчаткова вызваліць нашу краіну ад неабходнасці імпартаваць іх з Германіі.

Аўтаматамі, асвоенымі на нашым заводзе, зацікавілася Усесаюзнае аб'яднанне «Станкоимпорт», якое вывучае магчымасць вырабу іх у масавым серыйным выпуску.

ФРЭНКЕЛЬ Н. Б.,
дырэктар рачыцкага цвікавага завода «Інтэрнацыянал».

АД РЭДАКЦЫІ. Рэдакцыя зварачае ўвагу Дзяржплана БССР і Наркамлесцпрома на выключную важнасць праводзімай работы на заводзе «Інтэрнацыянал» па павышэнню прадукцыйнасці цвікавых варштатаў і асваенню выпуску шурупных аўтаматаў. Заводу патрэбна аказаць неадкладна рэальную дапамогу. У прыватнасці, «Звязда» зварачае ўвагу Наркамлесцпрома на недапушчальныя адносіны Белмашстанкатрэста (дырэктар т. Левін) да гэтай важнейшай справы, які па сутнасці тармозіць работу завода ў справе асваення аўтаматаў.

У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТУ

РАШУЧА ПЕРАБУДАВАЦЬ ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНУЮ РАБОТУ

Сталінская Канстытуцыя адкрыла новы перыяд у развіцці дыктатуры рабочага класа. Увядзенне Канстытуцыі СССР знамянуе наварот у палітычным жыцці краіны. Совецкая дэмакратыя на аснове Сталінскай Канстытуцыі атрымлівае далейшы росквіт. Дэмакратызацыя выбарчай сістэмы павышае палітычную актыўнасць мас. Дыктатура рабочага класа становіцца больш гібкай, яе база расшыраецца, яе аснова становіцца яшчэ больш моцнай.

Але толькі людзі, якія хварэюць ідыёцкай хваробай — бестурботнасцю, могуць лічыць, што пасля ліквідацыі эксплаататарскіх класаў класавая барацьба ў нашай краіне спынілася і быццам-бы адпалі насільственыя бакі дыктатуры рабочага класа. Нічога падобнага! Побач з мірнымі арганізатарскімі, культурнымі задачамі дыктатуры рабочага класа захоўваецца яе насільственны бок. «Дыктатуры рабочага класа, — гаварыў тав. Жданаў на Пленуме ЦК ВКП(б), — і надалей прыдзецца бязлітасная рукой перамагаць супраціўленне эксплаататараў і агентаў фашысцкай буржуазіі — трацкістаў, зіноўеўцаў, правых і іншых ворагаў народу».

Нашы поспехі не толькі не вядуць да змякчэння барацьбы агентуры капіталізма супроць социялізма, а, наадварот, яны выклікаюць яшчэ большае азлабленне ворагаў, якія пускаюць у ход самыя вострыя формы барацьбы. Ні на мінуту нельга забываць, што социялізм перамог толькі на адной шостай частцы земнага шара, што наша краіна знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, акружана ворагамі. Буржуазія бесперапынна пасылае да нас сваіх шпіёнаў, шкоднікаў і дыверсантаў. Агульнавядома, што капіталістычныя дзяржавы пасылаюць адна адной шпіёнаў і дыверсантаў. Агульнавядома, што германскія і японскія шпіёны шныраюць па ўсяму свету. Калі капіталістычныя дзяржавы пасылаюць шпіёнаў і дыверсантаў адна адной, то ўдвая-трая больш пасылаюць яны іх да нас, у першую ў свеце социялістычную дзяржаву. Капіталістычныя дзяржавы для подлай шпіёнскай, шкодніцкай і дыверсійнай работы выкарыстоўваюць астаткі і асколкі разбітых класавых ворагаў у нашай краіне. Трацкісты аказаліся знаходкай для сусветнага імперыялізма. Гэта — выгодная маска для стварэння ўсялякіх і ўсялякіх антысовецкіх, шпіёнскіх, дыверсанцкіх і тэрарыстычных груп. Судовы працэс на справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра з усёй відавочнасцю паказаў, што агенты і дыверсанты фашысцкіх разведак перафарбоўваюцца ў трацкістаў. Беспартыйны Страізаў, пачаўшы займацца шкодніцкай работай, стаў трацкістам. Стары прафесіянальны шпіён Грашэ — таксама трацкіст. Трацкізм ужо даўно ператварыўся ў банду наёмных забойцаў, шкоднікаў, дыверсантаў і лазутчыкаў фашызма. Усё гэта паказвае, што карэнні трацкісцкага шкодніцтва знаходзяцца не ўнутры нашай краіны, а ў Берліне і Токіо.

Зладзейскія злачынствы, якія былі ўчынены япона-нямецкімі трацкісцкімі агентамі, не могуць параўнацца з тым, што гэта шайка забойцаў, шпіёнаў і дыверсантаў мела намер зрабіць у час вайны. Ворагі рыхтавалі да моманту вайны ўчыненне жудасных злачынстваў. З судовага следства па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра вядома, што трацкісцкія агінікі рыхтавалі да моманту вайны ўзрыў Кемераўскага хімічнага камбіната, які мае выключна важнае абаронае значэнне. Японскі шпіён трацкіст Князеў да пачатку вайны намячаў заразіць смяротнымі бактэрыямі воінскія пазды і пункты санітарнай апрацоўкі войск. Ворагі народу — трацкісты і іх правыя пасобнікі рознымі сродкамі імкнуцца ўперціся ў наша давер'е. Яны добра разумеюць, што нельга шкодзіць бесперапынна — хутка пападзешся. Таму яны маскуюцца з тым, каб у зручны момант напаскудзіць, нашкодзіць. Трэба добра зразумець, што для таго, каб пабудаваць і весці прадпрыемства, патрэбны тысячы рабочых, а спаліць або ўзарваць яго можа адзін замаскаваны трацкісцкі шпіён-дыверсант.

Вось чаму нашы кадры не павінны ўкалыхваць сябе поспехамі, а павінны быць пільнымі скрозь і ўсюды. Пільнасць— гэта не кампанія, гэта важнейшая функцыя нашага жыцця. Чым большыя нашы поспехі, тым вышэй павінна быць пільнасць.

Палітычная блізарукасць значнай часткі не толькі партыйных работнікаў, але і гаспадарнікаў была прычынай таго, што трацкісцкія шкоднікі маглі беспакарана тварыць сваю гнусную падрыўную работу. Калі мы супаставім шкодніцтва «шахцінцаў» і шкодніцтва япона-нямецкіх трацкісцкіх агентаў, то ўбачым істотную розніцу. Шкоднікі-шахцінцы ашуквалі нашых гаспадарнікаў у галіне тэхнікі, бо яны тэхніку ведалі лепш, чым у той час яе ведалі нашы гаспадарчыя кадры. Трацкісцкім-жа шкоднікам удавалася спекуляваць на палітычнай блізарукасці нашых гаспадарнікаў. Ворагі народу з дапамогай падхалімства і двурушніцтва ўціраліся ў давер'е да некаторых кіраўнікоў і рабілі свае подлыя справы. Калі-б нашы гаспадарнікі, авалодаўшыя тэхнікай, адданыя партыі і сваёй радзіме, былі больш падрыхтаваны палітычна, яны не дапусцілі-б трацкісцкіх агіднікаў шкодзіць беспакарана.

Цэнтральны Камітэт партыі і таварыш Сталін ставяць таму перад нашымі кадрамі задачу авалодання большэвізмам. Стары лозунг аб авалоданні тэхнікай дапаўняецца новым лозунгам аб авалоданні большэвізмам, аб палітычным выхаванні кадраў. Правядзенне ў жыццё гэтага лозунга павінна знішчыць істотны недахоп у рабоце многіх і многіх партыйных арганізацый, якія, імкнучыся да навучання кадраў тэхніцы, забыліся аб галоўным—аб партыйна-палітычным выхаванні, аб расшырэнні палітычнага кругагляду, аб большэвіцкай загартоўцы кадраў.

Пленум ЦК ВКП(б) адзначыў факты надзвычайнай запушчанасці партыйна-палітычнай работы ў Азова-Чорнаморскім крайкоме, Кіеўскім абкоме, ЦК КП(б)У і ў іншых партыйных арганізацыях. У радзе партыйных арганізацый пачалі аднабакова захапляцца пытаннямі гаспаладаркі пры адсутнасці ўвагі да партыйна-палітычных пытанняў. Усё гэта не магло не прывесці да паслаблення сувязі партыйных арганізацый з масамі. Трэба, каб усе без выключэння комуністы зразумелі сутнасць дапушчаных памылак, каб партыйныя арганізацыі перабудаваліся на новы лад. Толькі выкрываючы памылкі і сумленна іх выпраўляючы, нашы кадры будуць расці далей, змогуць паспяхова вырашаць новыя грандыёзныя задачы па пабудове комуністычнага грамадства. Берагчы кадры — гэта не значыць замазваць іх памылкі. Берагчы кадры — гэта значыць выкрываць іх памылкі і дапамагаць гэтыя памылкі выпраўляць.

Аднабаковае захапленне партыйных арганізацый гаспадарчай работай і забыццё палітычных пытанняў прыводзяць да вузкага дзяляцтва, да страты правільнай палітычнай арыентыроўкі. У гэтым выпадку комуністы забываюцца аб капіталістычным акружэнні, аб ворагах, і становяцца дзялягамі, палітычна абмежаванымі людзьмі. Няправільна было-б, вядома, шарахнуцца ў другі бок — закідваць гаспадарчыя пытанні. Агульнавядома, што за сваю гаспадарку адказвае партыя, якая з'яўляецца душой дыктатуры рабочага класа. Але партыйныя арганізацыі не павінны падмяняць і абязлічваць совецкія і гаспадарчыя органы. Партыйныя арганізацыі, усямерна ўмацоўваючы гаспадарчыя і масавыя арганізацыі, павінны праз іх праводзіць свае рашэнні, накіроўваць іх работу.

Вастрэйшай і каштоўнейшай зброяй выхавання большэвіцкіх кадраў з'яўляецца большэвіцкая крытыка і самакрытыка. Таварыш Сталін вучыць нас, што «без крытыкі рухацца наперад нельга...», трэба «крытыкаваць адкрыта, чэсна, да канца, як належыць рэвалюцыянеру, выкрываць язвы нашай работы, не баяцца крытыкі, а пайсці ёй насустрач, не замазваць недахопы, прыслухоўвацца да голасу ўсіх работнікаў, не толькі вучыць работнікаў, але і вучыцца ў іх».

Абмеркаванне і правядзенне ў жыццё рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) выклічна новую хвалю крытыкі і самакрытыкі, не гледзячы на асобы. Толькі тупіца, або палітычна выхалашчаны чалавек можа «крыўдзіцца» на самакрытыку. Партыйны работнік, які не ідзе насустрач самакрытыцы, не ўмее ёй карыстацца ў штодзённай рабоце, не можа выканаць стаячых перад ім новых задач, не можа быць на ўзроўні новых, павышаных патрабаванняў.

Новыя задачы вынікаюць з увядзення Канстытуцыі СССР, з надыходзячых выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР. Перад тварам гэтых задач яшчэ больш узрастае роля комуністычнай партыі як кіруючага ядра ўсіх арганізацый працоўных. Партыя, закліканая ўстаць на чале новых, да канца дэмакратычных выбараў, павінна сама праводзіць паслядоўную дэмакратычную практыку, павінна сама паказаць прыклад захавання партыйных законаў. «Правядзенне дэмакратычных выбараў, — гаварыў тав. Жданаў у дакладзе на Пленуме ЦК ВКП(б),—гэта справа вельмі сур'ёзная. Гэта вельмі сур'ёзны экзамен для нашай партыі ў сэнсе праверкі яе сувязі з масамі, прапаздольнасці і аўтарытэта нашых партыйных арганізацый у масах. Правядзенне выбараў патрабуе велізарнага напружання ўсіх сіл нашай партыі».

Уся барацьба большэвікоў за социялізм заснавана на моцнай сувязі з масамі. Паварот, які адбываецца ў палітычным жыцці краіны, партыя можа сустрэць ва ўсеўзбраенні толькі глыбока перабудаваўшы свае метады работы, актывізуючы ўсю партыйную масу. Актывізацыя кожнага члена партыі з'яўляецца важнейшай умовай актывізацыі ўсіх працоўных. Перабудова ўсіх масавых арганізацый — профсаюзаў, советаў, комсамола — звязана з тым, « у якой меры ўласна перабудаваецца партарганізацыям, — гэта корань усіх рэчаў» (Жданаў).

У дакладзе тав. Жданава на Пленуме ЦК ВКП(б) з велізарнай сілай большэвіцкай самакрытыкі выкрыты недахопы партыйнай работы. Гэтыя недахопы зводзяцца да парушэння прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізма, прадугледжаных статутам партыі. Практыка парушэння прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізма, — падкрэсліваў у сваім дакладзе тав. Жданаў, — «тармозіць рост актыўнасці і самадзейнасці членаў партыі, прыніжае ў членаў партыі пачуццё гаспадара, перашкаджае ідэйнаму і палітычнаму росту членаў партыі, пазбаўляе членаў партыі іх законных правоў кантролю і над дзейнасцю парторганаў і тым самым парушае правільныя ўзаемаадносіны паміж кіраўнікамі і партыйнымі масамі, аслабляе партыю перад тварам стаячых перад ёй задач».

Распаўсюджанымі скрыўленнямі дэмакратычнага цэнтралізма былі парушэнні выбарнасці партыйных органаў. Тэрміны выбараў, як правіла, не захоўваліся. Выбарнасць часта падмянялася кааптацыяй кіруючых работнікаў. Сама працэдура выбараў ва многіх арганізацыях была ператворана ў простую фармальнасць. Галасаванне праводзілася спісамі, ды яшчэ падрыхтаванымі на папярэніх нарадах. Сапраўднага абмеркавання кандыдатаў у такіх выпадках па сутнасці не было. Партыя рашуча аднаўляе выбарнасць, уводзіць закрытае (тайнае) галасаванне пры выбарах партыйных органаў. Гэта дасць магчымасць ўсёй масе членаў партыі дасканала правяраць работнікаў, зробіць кожнага партыйнага работніка падкантрольным сваім выбаршчыкам.

Трэба звярнуцца да прыкладу Цэнтральнага Камітэта партыі, каб пераканацца ў тым, як ЦК паважае і наўхільна праводзіць у жыццё статут партыі і прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізма. У складзе Цэнтральнага Камітэта партыі няма ні аднаго члена, ні аднаго кандыдата, кааптаванага пасля партыйнага з'езда.

Праводзіць на справе большэвіцкі прынцып дэмакратычнага цэнтралізма— гэта таксама праводзіць на справе перыядычную справаздачнасць партыйных органаў перад сваімі выбаршчыкамі. Справаздачнасць, як і выбарнасць, стварае спрыяючыя ўмовы для разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі. Правядзіць справаздачнасць партыйных органаў — гэта значыць раіцца з масамі, вучыцца ў мас, перш за ўсё ў партыйнага актыва.

Закрытае (тайнае) галасаванне, ліквідацыя практыкі кааптацыі, аднаўленне выбарнасці кіруючых органаў партыйных арганізацый, забарона галасавання спісамі, неабмежаванае права адводу членамі партыі высоўваемых кандыдатур і неабмежаванае права крытыкі кандыдатаў— узнімуць актыўнасць партыйных мас для таго, каб ва ўсеўзбраенні сустрэць выбары ў Вярхоўны Совет Саюза ССР.

Новыя важнейшыя задачы павінны зразумець і глыбока засвоіць усе члены партыі. Гэта патрабуе ад партыйнага актыва дэтальнага вывучэння рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і стражэйшага правядзення іх у жыццё.

А. НАПОРКА.

КАЛГАСЫ ДРЫБІНШЧЫНЫ НЕ ГАТОВЫ ДА СЯЎБЫ

Сёлета Дрыбінскі раён усю плошчу ільна ў ліку 4 тыс. гектараў павінен засеяць гатунковым насеннем. На базах Заготільна ляжаць тысячы цэнтнераў насення для абмену. Але да гэтага часу калгасы не прыступілі да масавай вывазкі. Абмен затрымліваецца з прычыны таго, што Наркамзем БССР своечасова не даў распараджэння адпускаць ільнасемя для ўсіх калгасаў.

Увядзенне гатунковых пасеваў ільну ва ўсім раёне ставіць вялікую задачу перад раённым зямельным аддзелам. Увесь звычайны лён павінен быць абмянен. Аднак, сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў абмен не арганізаваны. Ёсць пагроза, што сартавыя пасевы будуць засмечаны звычайным ільном.

У раёне няма клопатаў аб гатунковых пасевах. Апрача ільну, згодна дзяржаўнага плана, патрэбна засеяць 5.360 гектараў гатунковых зернавых культур. Райземаддзел пайшоў па лініі змяншэння дзяржаўнага плана. Тут склалі свой план сяўбы збожжавых — 2.833 гектара, або на 2.527 гектараў менш устаноўленага плана Саўнаркома БССР.

Міжкалгасны абмен насення сарваны на віне райземаддзела. Замест плана абмену 783 цнт. ячменю, 734 цнт. пшаніцы і 120 цнт. аўса, абменена 10—15 цэнтнераў. Да абмену прыступілі толькі калгасы «Чырвоны прамень» і «Чурылава».

На базе Заготзярно калгасы павінны атрымаць насенную пазыку. Але, як выявілася, да гэтага часу авёс не ачышчан. Дзесяткі падвод варочаюцца назад.

Калгасы яшчэ поўнасцю не скончылі засыпку насенных фондаў. Нехапае канюшыны, канаплі і іншых культур. І гэта ніколькі не турбуе зямельны аддзел і яго загадчыка т. Балтунова.

Райземаддзел на прыняў патрэбных мер, каб калгасы своечасова і поўнасцю падрыхтаваліся да веснавой сяўбы. Тут толькі складаюць зводкі аб ходзе засыпкі і ачысткі, а сапраўднага становішча ў калгасах не ведаюць.

Напрыклад, па зводцы райземаддзела нібы ўсё насенне ачышчана. У сапраўднасці-ж ачыстка ў большасці калгасаў зрываецца, вялікая засмечанасць і нізкая ўсхожасць. Насенная кантрольная станцыя доўгі час не працуе. Атраномы-апрабатары чакаюць, пакуль калгасы самі прывязуць насенне для аналізу.

Па плану ў гэтым годзе патрэбна зазеляць 500 гектараў зернавых яравізаваным насеннем. Між тым у раёне яўна недаацэньваюць гэта адно з важнейшых агратэхнічных мерапрыемстваў у падняцці ўраджайнасці.

Літаральна такое-ж становішча ў падрыхтоўцы сельскагаспадарчых машын. Райземаддзел не ведае нават колькі ёсць сеялак. Замест падрыхтоўкі машын тут зноў заняліся скарачэннем дзяржаўнага плана радковай сяўбы больш, чым на 2.000 гектараў.

Ці выпадкова гэта? Варта ўнікнуць у работу райземаддзела, каб упэўніцца, што гэта не выпадкова. Такая практыка работы дрыбінскага райземаддзела. Штодзённую дапамогу і кіраўніцтва калгасамі падмянілі канцылярскім кручкатворствам. Кожны дзень пасылаюць тэлефанаграмы і дырэктывы, якіх, па звычаю, ніхто не чытае.

Усё гэта таму, што райземаддзел адарваўся ад калгасаў. Шырокія масы калгаснікаў не мабілізаваны на баявую сустрэчу веснавой сяўбы. Як вынік — ні адзін калгас не выканаў зімовага плана вывазкі гною і торфу, не адрамантаваў інвентар, сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай сярод калгасаў раёна не разгорнута.

Калгасы Дрыбінскага раёна сустракаюць веснавую сяўбу непадрыхтаванымі.

А. ЛОСЬ.

Жулікі на мазырскім мясакамбінаце

Пры складанні баланса за 1936 год бухгалтар канторы мазырскага мясакамбіната Івашкевіч раптам «выкрыў», што па каўбаснаму цэху не хапае 2.525 кілаграм мяса. Далажыўшы аб гэтым дырэктару Фельдману, ён прапанаваў свае паслугі — утоіць нястачу. Фельдман згадзіўся з камбінацыяй, прапанаванай Івашкевічам. Шляхам падчысткі лічбаў у актах Івашкевіч дадаў: на косці 1.008 кілаграм, на жылкі 200 кілаграм і на страты 340 кілаграм. Астатнія 977 кілаграм былі спісаны з каўбаснага цэха, як быццам недаатрыманыя з базы. А каб не было недахвату на базе, склалі акт на «ўсушку».

Так была пакрыта злачынная работа жулікаў, якія раскралі больш 2,5 тоны мяса. А колькі яго раскрадваецца жывой вагой — гэта вядома толькі самім зладзеям і іх саўдзельнікам. Абважваючы здатчыкаў жывёлы, загадчык базы Фішман накапліваў запас жывой вагі. Потым ён вытвараве жульніцкія махінацыі шляхам абмену жывёлы з прыватнікамі. Яны прыводзяць худых кароў і цёлак, а ён дае ім з базы сытых, атрымліваючы ў дадатак барышы. Немала было выпадкаў патаемнага знікнення з базы сытых кабаноў. Замест іх у свінарніку з'яўляліся малыя падсвінкі.

У каўбасным цэху штучна павялічваецца процант выхаду каўбасных вырабаў супраць устаноўленага стандартам шляхам сістэматычнай іх недасушкі ў капцілцы. За 1936 год сярэднегадавы выхад украінскай каўбасы складаў 77 проц., замест 75 стандартных. З затрачаных на выраб 158 цнт. мяса павінна было выйсці 118,5 цнт. каўбасы, а вышла 121,5 цнт. Такім чынам, лішнія тры цэнтнеры прададзены спажыўцу ў выглядзе звычайнай вады. Па кракаўскай каўбасе процант выхаду яшчэ больш. Замест стандартных 75 процантаў вышла 78.

Гэта нічым не апраўданае злачынства практыкуецца і ў 1937 годзе. У студзені процант выхаду украінскай каўбасы складае 78,5 проц.

Начальнік каўбаснага цэха Зубрыцкі быў ў 1932 годзе выключан з партыі за антызапрыгожаўныя дзеянні ў калгасе і асуджан на 5 год пазбаўлення волі. Адбыўшы пакаранне, гэты прайдзісвет знайшоў сабе прытулак спачатку на мясакамбінаце ў Гомелі, а потым перавандраваў у Мозыр. Карыстаючыся апякунствам Фельмана, ён раскрадваў дзяржаўную маемасць.

Партыйная арганізацыя мазырскага аддзялення Белхарчгандля, у якую ўваходзяць комуністы камбіната, праходзіць міма ўсіх гэтых злачынстваў. У гэтым няма нічога дзіўнага, бо сакратаром партыйнага камітэта гэтай арганізацыі з'яўляецца ніхто іншы, як сам Фельдман. Асобныя рабочыя камбіната спрабавалі выкрываць на сходах зладзейскія махінацыі Зубрыцкага і Фішмана, але Фельдман рэагаваў на іх крытыку па-свойму. Вартаўніка Пінчука ён зволіў за гэта з работы. Такі-ж лёс падзялілі і некаторыя іншыя рабочыя.

Хіба можна злічыць зараз таму, што ні адзін рабочы на сходах не выступае. Ды і самі-ж сходы бываюць вельмі рэдка. Вытворчыя нарады зусім не праводзяцца. На камбінаце пануе антысанітарыя і безгаспадарчасць.

На наступаючыя сігналы аб заціску крытыкі з боку Фельдмана Мазырскі райком не рэагаваў. Інструктар райкома Трэспер заглянуў нешк раз на камбінат для расследвання заявы загадчыка ўбойнага цэха т. Цімковіча, павярнуўся і зноў знік. Ні з адным рабочым ён не пагутарыў, не пацікавіўся становішчам палітычнай работы сярод іх. Між тым гэта работа зусім закінута.

Р. ФРАЛОЎ.

У ШКЛОВЕ САМАКРЫТЫКА НЕ У ПАШАНЕ

У шклоўскай раённай партыйнай арганізацыі доўгі час культывавалася сістэма падхалімства і грубага заціску самакрытыкі. Самая малейшая крытыка работнікаў раённых устаноў (ужо не гаворачы аб райкоме партыі) бралася ў штыкі.

У раёне парушаўся асноўны прынцып большэвізма — статут партыі. Склад пленума райкома быў абран у студзені 1934 года. За гэты час змяніліся тры сакратары райкома, але ні адзін з іх не адчуваўся перад комуністамі. Сакратар райкома Ермакоў вось ужо два гады працуе, аднак, не рабіў ні адной справаздачы перад членамі партыі.

Райком партыі наогул ужо даўно не існуе. Больш шасці месяцаў як ніхто не думае склікаць пленума.

Ад райкома вучыліся і пярвічныя арганізацыі раёна.

Так, у пярвічнай арганізацыі папяровай фабрыкі «Спартак» партыйны камітэт 4 гады не пераабіраўся і не адчитваўся перад членамі партыі. За гэты час змяніліся 3 сакратары парткома. Быў сакратаром парткома Лабанок, яго вылучылі інструктарам райкома. Аднак, Лабанок таксама не рабіў справаздачы, ён проста перадаў партыйныя справы Харытонаву, які нават не быў членам парткома. Харытонаў развалій партыйную работу на фабрыцы, зрываў арганізацыю стаханаўскіх скразных брыгад, заціскаў крытыку і самакрытыку, і на гэта райком не зварачаў увагі. І толькі ў часе абмену партыйных дакументаў Харытонава выкрылі як ашукальніка і заядлага ворага народа. Ён з радоў партыі выключан.

У пярвічнай арганізацыі фабрыкі існуе адкрыты заціск самакрытыкі. Дырэктар фабрыкі Халаменюк груба і нячула адносіцца да рабочых. І калі аб гэтым быў змешчан матэрыял у раённай газеце, які перадрукавала шматтыражка фабрыкі, Халаменюк напаў на рэдактара Грыгор'ева з кулакамі, гаворачы: — «якое ты меў права перадрукоўваць гэты матэрыял». Самадур Халаменюк прыбягае ў райком са скаргай на работнікаў рэдакцыі раённай газеты. Райком-жа ў сваю чаргу не рэагаваў на адкрыты заціск самакрытыкі з боку Халаменюка. Вось чаму ён рашыў ўадзейнічаць на газету сваім службовым становішчам (як дырэктар папяровай фабрыкі). Увесь час, да змяшчэння матэрыялаў у газеце, ён адпускаў паперу з адыходаў для патрэб рэдакцыі. Зараз адыходы паперы вагонамі адпраўляе сваім знаёмым і катэгарычна адмовіў рэдакцыі. Становішча партыйнай арганізацыі фабрыкі не выключэнне.

У пярвічнай партыйнай арганізацыі райсаюза і зараз займаюцца дробнымі гаспадарчымі пытаннямі ў шкоду партыйна-выхаваўчай рабоце. Партыйныя сходы не з'яўляюцца школай большэвіцкага выхавання комуністаў. Давод прывесці адзін толькі прыклад, каб паказаць на якім нізкім ідэйным узроўні праходзяць партыйныя сходы.

21 чэрвеня на партыйным сходзе слухалі пытанне аб выніках абмену партыйных дакументаў. На гэтым сходзе прысутнічаў інструктар райкома Кучараў. І вось, у прысутнасці інструктара па такому важнейшаму палітычнаму пытанню прынята наступная пастанова:

«Адзначыць, што пасля абмену партдакументаў палепшылася ўся партыйная работа... У далейшым неабходна:

1. Для лепшага правядзення загатоўчай кампаніі абавязаць Роніна падрыхтаваць склады, тару, насілкі. Неабходна забяспечыць крамы косамі, малаткамі і т. д.

2. Даручыць тав. Роніну сістэматычна праводзіць падрыхтоўчую работу з кандыдатамі партыі.

3. Тав. Вараб'ёву перабудаваць ячэйку АСО».

Зусім не дзіва, што ў гэтай арганізацыі існуе кругавая парука. Комуністы не крытыкуюць недахопаў адзін аднаго. Партыйная арганізацыя адарвана ад беспартыйных рабочых райсаюза. З работнікамі апарата не праводзіцца ніякай палітычна-масавай работы. І не выпадкова, што ў апараце райсаюза існавала і існуе сістэма абмервання, абважвання, грубыя і нячулыя адносіны да пакупнікоў. Тут арудуюць класавыя вораги. Большасць магазінаў ператворана ў закрытыя размеркавальнікі. Старшыня праўлення райсаюза Ронін распараджаецца дзяржаўнымі сродкамі як уласнымі. І на ўсё гэта, не гледзячы на неаднаразовыя сігналы комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных, райком і яго сакратар Ермакоў не зварачалі ўвагі. Такія абураючыя факты лічылі зусім нармальным з'явішчам.

Райком комсамола на аснове сігналаў арганізаваў рэйд «лёгкай кавалерыі» па праверцы работы райсаюза. Пры гэтым былі выяўлены парушэнні законаў совецкага ўрада і партыі аб вольным гандлі. Матэрыял рэйда быў накіраван у райком партыі. І вось сакратар райкома Ермакоў узяўся за абарону гонару мундзіра работнікаў райсаюза. Пад непасрэдным націскам Ермакова бюро райкома вынесла папярэджанне сакратару райкома комсамола Маскаліку і загадчыку райфа Іванчанка, быццам-бы за тое, што яны ўмяшаліся «не ў свае справы» (?!). Гэта значыць, за арганізацыю рэйда «лёгкай кавалерыі».

Зараз сакратар райкома партыі Ермакоў можа быць спакойны, бо райком комсамола больш рэйдаў не адважваецца арганізоўваць і наогул работа «лёгкай кавалерыі» ў раёне развалена.

Не зварачаў увагі райком партыі і на такое абураючае становішча, калі комуністы райсаюза перасталі гутарыць з комсамольцамі, нават лічачы іх ворагамі за тое, што яны напісалі заяву ў Камісію совецкага кантроля аб злоўжываннях ў райсаюзе.

Як не дзіўна, але бюро райкома партыі не абмеркавала нават рашэння Камісіі совецкага кантроля аб злоўжываннях у апараце райсаюза. Міма гэтага прайшла і пярвічная арганізацыя. Пералічаныя факты яркa паказваюць, што ў раёне яшчэ не навучыліся прыслухоўвацца да голасу прапоўных, не зрабілі неабходных вываадаў з рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) аб перабудове ўнутрыпартыйнай і партыйна-выхаваўчай работы.

Б. РОБЕРМАН.

ЗРЫВАЮЦЬ ЗАНЯТКІ З МАЛАПІСЬМЕННЫМІ

У калгасе імя Варашылава Мозалаўскага сельсовета, Мсціслаўскага раёна шмат малапісьменных. Не гледзячы на гэта, заняткі з імі ў школе не наладжаны і часта зрываюцца. Заняткі працягваюцца не больш адной гадзіны. Некаторыя малапісьменныя зусім не наведваюць школу.

Загадчыца школы Федасенка больш цікавіцца адкормам свіней, чым заняткамі.

ПАЛТАЎСКІ.

РАСТРАТЧЫКІ КААПЕРАТЫЎНЫХ СРОДКАЎ

(Па пісьмах у рэдакцыю)

Совецкі гандаль — адзін з важнейшых участкаў соцыялістычнага будаўніцтва. У магазінах і на складах гандлюючых арганізацый сканцэнтраваны велізарныя багацці. Работнікі кааперацыі і Дзяржгандля штодзенна і штогадзінна сустракаюцца з масамі людзей. Яны прызваны абслугоўваць штодзённыя патрэбы совецкага пакупніка. Пагэтаму ворагі народу імкнуцца пранікнуць ў гандлёвы апарат, бліжэй да соцыялістычнага багацця, каб арганізаваць тут раскраданні, шкодніцтва.

У рэдакцыю паступае многа пісем ад работнікаў прылаўка, пайнікаў, рахункаводаў, у якіх яны прыводзяць факты грубага зажыму самакрытыкі, патурання растратчыкам, сямейнасці з боку мясцовых кіраўнікоў кааперацыі.

У клімавіцкім горспажыўсаюзе арудуе цэлая зграя растратчыкаў. Загадчык крамы № 8 Пабока ў 1936 г. растраціў 7.000 руб. Родзіч растратчыка, старшыня горспажыўсаюза Аўсянка разам з намеснікам Ліснікавым і галоўбухам Струнавым «выратавалі» свайго сабутэльніка ад адказнасці. Пасля гэтага Пабока прызначаецца гэтымжа Аўсянкай загадчыкам крамы № 7. І тут «здольны» кааператар робіць растрату ў 1100 руб. Новае злачынства Пабокі зноў замазваецца.

Другі відны «дзеяч» горспажыўсаюза Красоўскі растраціў у мінулым годзе каля 1000 руб. Але гэта не перашкаджае яму далей спакойна працаваць у кааперацыі.

У апараце горспажыўсаюза груба заціскаюць самакрытыку. Аўсянка беспадстаўна звальняе з работы незадаволеных ім людзей.

Гр. Зайцаў паведамляе нам, што старшыня тошчыцкага сельпо Чырвонабярэжскага сельсовета, Быхаўскага раёна, Скобаў растраціў 7.000 рублёў. Скобаў ужо судзіўся раз за растрату кааператыўнай маемасці.

9 сакавіка на перавыбарах праўлення парторг сельсовета Тарасава пастаралася апраўдаць растратчыка Скобава і палерокор жаданням пайшчыкаў яго палічылі загатоўшчыкам гэтага сельпо. Гэтай-ж Тарасава настаяла на зняцці з работы вартаўніка магазіна Лістрапенка Пярэнція, які неаднаразова выкрываў работнікаў сельпо ў іх цёмных справах.

Тав. Букініч з Каспоковіцкага раёна піша, што сельпо Парэцкага сельсовета ператворана ў закрыты размеркавальнік. Грэчневая мука і печаны хлеб тут адпускаецца з нагрузкай маннай крупы. Старшыня сельпо Гаўрыленка адпускае больш ходкія тавары з-пад прылаўка сваім знаёмым і ўкрывае іх ад пайшчыкаў.

У аддзяленні барысаўскага ваенгандля многа растрат. Загадчык сталовай Ежгуновіч растраціў каля 5 тыс. рублёў. Начальнік ваенгандля Астапаў пасля гэтага накіраваў яго ў другую сталовую, дзе ён зноў растраціў 3 тыс. руб.

Буйныя растраты ёсць у заг. магазіна Хмялёўскага (5 тыс. руб.), заг. буфета Франчука (5 тыс. руб.). Новы загадчык сталовай Кармілевіч штодзенна прысвойвае па 15—20 рублёў. Калі буфетчыца, жонка чырвонаармейца Мязведская сказала яму аб гэтым, Кармілевіч без усякіх падстаў зволіў яе з работы. Астапаў санкцыянаваў гэта мерапрыемства.

З прыведзеных намі фактаў яскрава бачна, што растратчыкі — раскрадальнікі кааператыўнай уласнасці зусім адкрыта творацъ свае злачынныя справы. Сельская кааперацыя ў радзе раёнаў прадастаўлена сама сабе. Ворагі народу звілі сабе там цёплае гняздо.

РЭКОРДЫ СТАХАНАЎЦАЎ

ГОМЕЛЬ. Стаханаўцы новабеліцкага дрэваапрацоўчага камбіната імя Гікало адказваюць на зварот данбасаўцаў новымі вытворчымі перамогамі.

Памочнік электразваршчыка двухсэтнік Ракоўскі перайшоў працаваць па 2 варштаты. Пры норме ў 720 калец ён зварвае 2.525 — 351 проц. нормы.

Маладыя электразваршчыкі Агеенка і Самусенка выконваюць свае нормы на 200 проц. Стаханавец Пахомаў зварвае за змену 700 шып (норма 450). Падгібшчык калец Цэлькін пры нэрме ў 1.200 выпускае 2.000 штук.

Стаханаўцы электразварачнага цэха арганізоўваюць перадачу свайго вопыту нестаханаўцам.

Значна павысілі сваю прадукцыйнасць стаханаўцы малярна-зборачнага цэха. Рабочыя Бялепкі і Пяўноў збіраюць за змену 120—150 перадкоў калёс замест 80. Такіх поспехаў яшчэ ніколі не было.

Сутачнае заданне цэха шырспажыву складае 290 крэслаў сістэмы «шат». Калектыў рабочых абавязаўся ў бліжэйшыя дні давесці выпрацоўку да 400 штук. Зараз цэх дае па 360 крэслаў.

Б. РАБІКАЎ.

ШЭСЦЬ НОРМ ЗА ЗМЕНУ

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу). Днямі лепшы стаханавец аўтарэмзавода каваль Астапаў стаў на вахту імя Серго Орджанікідзе і выканаў сваю норму за змену на 582 проц. У другую змену стаў на вахту токар Кушнараў. На апрацоўцы газаўскіх ступіц ён даў 600 проц. нормы.

Дырэктар завода НІКАНОРАЎ.



Праект новага пляца Советаў у Менску на левым беразе ракі Свіслач.

Г. В. ЯКУШКА

Галоўны гарадскі архітэктар.

ПЕРСПЕКТЫВЫ РЭКАНСТРУКЦЫІ ГОРАДА МЕНСКА

Сакрэт кожнага прыгожага горада заключаецца ў тым, што ў ім ёсць вялікія прыгожыя пляцы і шырокія парадныя вуліцы з архітэктурна афармленымі будынкамі, ёсць паркі, сады, газоны, дрэвавыя насаджэнні, кветкі і добрая глыбакаводная рака. Такім культурным і прыгожым горадам станэ і сталіца БССР — Менск.

Менскі гарадскі совет ужо цяпер намячае мерапрыемствы, якія ператвораць сталіцу БССР у бліжэйшы час у сапраўдны культурны сталічны горад. Па генеральнаму плану рэканструкцыі Менска намечана многа вялікіх плошчаў.

Плошча перад Домам урада будзе пашырана і стане парадным пляцам сталіцы. Тут будуць адбывацца масавыя дэманстрацыі і ваенныя парады. Дом металістаў і дзеравяныя будынкі насупроць Дома ўрада будуць знесены або перасунуты ў іншае месца. Плошча павялічыцца ў 4—5 разоў. Совецкая вуліца ў гэтым месцы будзе ўключана ў плошчу. Па ёй будуць хадзіць прыгожыя бясшумныя тралейбусы.

Вакол плошчы вырасце шмат многапавярховых будынкаў Універсітэцкага гарадка і наркаматаў. Пляц будзе заліт асфальтам, афармлен вазамі, помнікамі і ярка асветлен.

На Совецкай вуліцы за ракой Свіслач, на яе левым баку, праектуецца зусім новы пляц вельмі вялікіх размераў,—160 метраў шырыня і 340 метраў даўжыня. Гэта будзе самы вялікі пляц горада. Ён будзе называцца — пляц Советаў. На ім будзе стаяць велічэзны будынак горсовета.

Рака Свіслач ў гэтым месцы будзе паглыблена і пашырана, а яе берагі—апранутыя ў граніт. Набережная ўпрыгожыцца лепшымі ўзорамі совецкай скульптуры. На другім баку пляца намечана будаўніцтва вялікага музея. Супроць будынка горсовета пабудуюць вялікі кінотэатр з залай на 2500 глядзачоў і асобнай залай для дзяцей.

Пляц Волі пашырыцца за лік знесенага сабора і дамоў, якія не маюць архітэктурнай каштоўнасці і па свайму стану падлягаюць зносу ўжо ў бліжэйшы час. Для пашырэння гэтага пляца будзе знесена таксама частка дамоў па Школьнай вуліцы. Пляц Волі будзе складацца з 2 пляцаў—верхняга і ніжняга. Апошні будзе размяшчацца ў новым парку культуры і адпачынку, будаўніцтва якога намечана на месцы існуючай забудоўлі па Нямізе і ўздоўж ракі Свіслач да Весялоўкі і Дразлоў. Верхні пляц з ніжнім будзе злучацца прыгожа афармленай вялікай парадной лесніцай.

Апрача гэтых вялікіх пляцаў запраектавана стварыць цэлы рад пляцаў у розных пунктах горада. Пляц каля новага вялікага тэатра, які цяпер будуецца на плошчы Парыжскай Камуны. Тут будзе разбіт шырокі бульвар з падыходамі да ракі. З трох бакоў пляц будзе акаймлёны вялікімі сямі- і васьміпавярховымі дамамі. Намячаецца яшчэ пляц у вілах Лагойскага і Барысаўскага трактаў. Там, дзе цяпер таварна-чыгуначная станцыя намячаецца будаўніцтва новага вакзала і вялікага пляца. Па меры росту горад будзе разбіт на асобныя раёны. У кожным будуць свае пляцы. На іх будуць пабудаваны дамы гарадскіх раённых советаў, раённыя школы і інш. будынкі. Усяго па гораду намечана пабудаваць 10 вялікіх пляцаў.

Менскія вуліцы вельмі вузкія, іх шырыня ад 7 да 18 метраў. Часцей вуліцы крывыя, перасякаюцца ў многіх месцах іншымі вуліцамі не пад простым кутом. Генеральным планам ставіцца задача зрабіць усе вуліцы шырэй у 3—4 разы. Без змен астанецца толькі вуліца Карла Маркса, якая выдатна забудавана і добра ўпарадкавана. Яе пашырэнне не выклікаецца ніякімі меркаваннямі.

Совецкая вуліца, шырыня якой 18—20 метраў, пашырыцца ў тры разы, да 60 метраў. Шырыня тратуараў на гэтай вуліцы будзе па 6 метраў з кожнага боку. Чатырма радамі будуць пагнуцца ўздоўж вуліцы зялёныя насаджэнні.

Апрача вуліц праектуюцца шырокія бульвары, гэта значыць зеляныя вуліцы шырынёй 80—100 метраў. Большасць вуліц будзе пакрыта асфальтам, клінкерам і брушчаткай.

Новым праектам планіроўкі прадугледжваецца значнае павелічэнне зялёных насаджэнняў і правільнае іх размеркаванне. Усе кварталы вуліц і пляцаў будуць насычаны зеленню. Асобныя кварталы намячаюцца з раскрытымі ўнутранымі зялёнымі насаджэннямі, якія аб'ядноюцца з вулічнай зеленню, а апошнія пераходзяць у зелень бульвараў, скверaў і паркаў. Шырокія вуліцы намечана азеляніць паласамі, якія пойдуць уздоўж вуліц, прычым 2 палосы ахопяць трамвайныя шляхі і 2 аддзеляць пешаходныя і веласіпедныя дарожкі ад транспартнай часткі вуліц.

На перыферыі горада прадугледжваецца трохкіламетровая абаронная зялёная зона для азанавання патокаў паветра, якое паступае ў горад. Праектуецца разбіўка цэнтральнага парка культуры і адпачынку на месцы былой ракі Нямігі ў паўночным напрамку па вытоку ракі.

Да гэтага парку прылягае масіў у раёне Весялоўкі, які размешчан на рэльефнай і маляўнічай мясцовасці. Рака тут не забруджана і можа быць асвоена для арганізацыі воднага спорту. Тэрыторыя камароўскага балота, якая ўрэзваецца ў граніцы горада, таксама цалкам азеляняецца і асушваецца пры дапамозе дрэнажа. Існуючы парк «Профінтэрн» пашырыцца і на другі бок ракі. Ён будзе працягам новага цэнтральнага парка культуры і адпачынку ад пляца Волі на поўдзень да Антонаўскага лесу. Апрача ўсяго, у горадзе намечаны палосы зелені, якія агародзяць прамысловыя прадпрыемствы ад забудоў жыллёвых і грамадскіх. Агульная колькасць зелені па планіроўцы намечана ў колькасці 66,8 квадратных метраў на аднаго жыхара.

Адной з цікавых работ па ўпарадкаванню Менска з'яўляецца ўрэгуляванне ракі Свіслач. Рака перасякае горад з поўначы на поўдзень па цэнтру і з'яўляецца воднай базай праектуемага цэнтральнага парка культуры і адпачынку. Малаводная і забруджаная адкідамі і сточнымі водамі, Свіслач стане глыбакаводнай ракой. Гарызонт вады будзе павышан, будуць створаны некалькі архітэктурна патрэбных водных люстраў. Будуць выраўнены і ўпарадкаваны берагі. Набережныя апрануцца ў граніт, будуць зроблены спускі да вады, лодачныя станцыі, купальныя басейны.

У вярхоўі ракі ў 13 кіламетрах ад горада мяркуецца стварыць вялікі водахавальнік. Там будуць захоўвацца веснавыя воды і ў летні перыяд рака будзе адтуль папаўняцца свежай вадой. Гэта вызваліць Менск ад катастрафічных паводак, якія прыносяць буйныя страты.

Адначасова палепшацца санітарныя ўмовы ракі і будзе азеленена прыбярэжная зона. Зрабіць раку суднаходнай у межах горада няма магчымасці з прычыны выключнай звілістасці і малаводнасці ракі. Аднак унізе па плыні рака будзе выкарыстана для падачы з прылягаючых раёнаў паліва для патрэб горада. Для гэтага намячаецца пабудова невялікага порту ў паўднёвай частцы горада.

Выяўленне характару архітэктуры будынкаў будучага Менска з'яўляецца задачай, складаючай частку вялікай, цяжкай і важнай праблемы сёнешняга дня.

Вырашэнне гэтай праблемы ўскладзена партыяй і ўрадам на архітэктурныя сілы краіны. Соцыялістычная архітэктура павінна быць перш за ўсё ідэйнай, выразнай, багатай сваёй сілай і магутнасцю і ў той-жа час простай і радаснай, як наша шчаслівае жыццё. Кожны будынак, намечаны да пабудовы, павінен служыць і быць упрыгожаннем горада ў цэлым.

Новым генеральным планам рэканструкцыі Менска адкрываецца новая эпоха ў архітэктурнай творчасці горада. Ніколі яшчэ да гэтага часу Менск не меў такой магчымасці стварыць архітэктуру комплексаў цэлых участкаў, кварталаў і плошчаў. Такая каштоўнасць замыслу і ансамблёвае рашэнне забудовы горада нямыслімы ў капіталістычных умовах.

Ужо на бліжэйшы час намечаны да ажыццяўлення вялікія пабудовы, якія маюць вялікае архітэктурнае значэнне: будынак ЦК КП(б)Б на пляцу Волі, будынак горсовета, драматычны тэатр, 7 будынкаў раённых пэнтраў, вакзал, дом радыё, дом трастаў, універмаг, будынкі грамадскага, культурна-асветнага значэння, рад жыллёвых дамоў і будынкаў фабрычна-заводскага значэння.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, пры дапамозе архітэктараў брацкіх рэспублік і ўсёй совецкай грамадскасці Менск будзе выведзен на шырокі шлях рэканструкцыі і будзе вызначана яго далейшае аблічча.

Буйная перамога на гвадалахарскім фронце

Урадавыя войскі занялі горад Брыуэга, разбіўшы італьянскую дывізію

(Па талефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Праўды»)

БРЫУЭГА, 19 сакавіка. На гэты раз можна гаварыць ужо не аб поспеху, а аб досыць значнай перамозе рэспубліканскіх сіл на гвадалахарскім фронце. Гэтай ноччу пасля кароткай артылерыйскай і авіяпыйнай падрыхтоўкі рэспубліканцы атакавалі з двух бакоў горад Брыуэга; занялі яго і захапілі больш 200 палонных, адкінулі італьянскія экспедыцыйныя дывізіі за грэбні акружаючых вышынь.

К раніцы ў праліўны дождж мы прыязджаем у Брыуэгу. Шаса зноў, як напярэдадні, заграмаджана італьянскімі гарматамі, мартырамі, грузавікамі (70 штук), калючым дротам, скрынкамі снарадаў, патронаў, ручных бомб і інш. снаражэннем. Аднаго толькі бензіну было захоплена 100 тыс. літраў. Рэспубліканцы зараз адчулі на практыцы, што значыць браць трафеі: некалькі брыгад поўнасцю ўзброіліся, апрануліся і абуліся за кошт італьянцаў.

Непадалёку ад уезду ў горад, на выгібе шасы мы бачым патрасаючую карціну. Бомбамі рэспубліканскіх самалётаў, скінутых са здзіўляючай меткасцю, былі ўзарваны 4 грузавікі з гарматамі і патронамі. Усё гэта ўзарвалася і пасля само страляла ва ўсе бакі.

У самым Брыуэге, у сярэднявяковым паэтычным гарадку, толькі зараз пачынаецца палахлівае ажыўленне. Люзі выпаўзаюць звонку, асцярожна аглядваюцца і, пачуўшы ветлівыя волгукі рэспубліканскіх салдат, адразу расцвятаюць. Дзве чорнабровыя вачыстыя цёткі, перабіваючы адна адну і ўсхліпваючы, страсна расказваюць, колькі пакут яны напаркеліся за 8 дзён фашысцкага ўладаніпітва ў гарадку. Італьянцы апустошылі ўсе кладовыя, усе склепы, перарэзалі ўсю жывёлу і птушку, згвалтавалі некалькі жанчын, расстралялі 36 чалавек, у тым ліку двух старых-настаўнікаў, па абвінавачанню ў спачуванні народнаму фронту. У гарадку распараджаўся італьянскі ваенны камендант, і яму падначальвалася і мясцовая іспанская фашысцкая арганізацыя. Пры заняцці горада некалькі сямействаў, абвясціўшых раней сябе рэспубліканцамі, вывесілі на дамах манархічныя сцягі і сустракалі завалавальнікаў кветкамі. Зараз яны, вядома, уцяклі, але на двух балконах яшчэ мокне нешмацё фашысцкіх сцягаў.

Упякалі італьянцы з Брыуэгі літаральна панічна, амаль нічога не паспелі эвакуіраваць. Забылі нават увесці 12 коней, якіх паставілі на пастой у старыннай царкве — здзіўляючым будынку ранняга раманскага стылю.

Мы ўваходзім ў памяшканне манастырскай семінарыі. Тут быў штаб другой італьянскай дывізіі. Усё перавернута дагары: мэбля, паперы, карты, астаткі ежы.

Сярод дакументаў штаба дывізіі знойдзен наступны загад, які мы прыводзім дакладна, літара ў літару, і без усякіх каментарыяў.

«13 сакавіка 1937 года, пятнаццаты год фашысцкай эры.

Па пытанню аб тэлеграме дуча.

Паведамляю наступную тэлеграму, якую мне прыслаў дуча:

«На борту парахода «Пола». На якім я еду ў Лівію, я атрымаў паведамленне аб вялікім баі, які адбываецца зараз на гвадалахарскім напрамку. З упэўненым сэрцам сачу за развіццём гэтага бою, таму, што пераконан у тым, што энтузіязм і ўпартасць нашых легіянераў перамогуць супраціўленне праціўніка. Зн'ішчэнне інтэрнацыянальных сіл будзе поспехам велізарнага значэння і, зазбліва, поспехам палітычным. Паведамце легіянераў, што я гадзіна за гадзінай сачу за іх дзеяннямі, якія будуць увенчаны перамогай. Мусаліні».

Дывізійны генерал
Маццыні».
(пячатка)

На пісьмовым стале ляжыць нумар газеты. Гэта «Джорнале д'Італіа» ад 9 сакавіка гэтага года. На першай старонцы, на самым відным месцы, пад вызываючымі загалоўкамі паведамляецца аб «нацыянальным» наступленні на Гвадалахару. У паведамленні не гаворыцца, чые нацыянальныя часці, іспанскія або італьянскія, вядуць наступленне. Затое падкрэсліваецца, што Брыуэга знаходзіцца пад жорсткім агнём 100 гармат.

Газета хоць і свежая, але ўжо ўстарэла.

З 100 гармат, якія абстрэльвалі Брыуэгу, італьянцы не далічваюцца многіх. Не далічваюцца яны і самой Брыуэгі.

Міх. КАЛЬЦОЎ.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 19 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае паведамленне камітэта абароны Мадрыда, апублікаванае ў поўдзень.

У паведамленні гаворыцца, што на фронце Гвадалахары (на паўночны ўсход ад Мадрыда) рэспубліканцы дабіліся бліскучых поспехаў. Пасля заняцця Брыуэга ў разультаце яраснага бою і пасля бегства італьянскіх войск, займаўшых гэты раён, рэспубліканцам удалося заняць шмат вёсак, у прыватнасці, Гарголес дэ Арыба, Хуэтос, Вільявісіеса, Дэ Тахунья, Канерваль, Вальдэарэнас, Вальдэандрэтас.

Захвачана вялікая колькасць ваеннага снаражэння: 6 гармат, 30 кулямётаў, шмат вінтовак. Лік італьянскіх палонных перавышае 150. Сярод забітых італьянцаў — 7 афіцэраў, у тым ліку адзін падпалкоўнік.

Афіры бамбардыроўкі Мадрыда

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 18 сакавіка (БЕЛТА). Згодна паведамлення, апублікаванага ў Валенсіі, з 7 лістапада мінулага года сярод грамадзянскага насельніцтва Мадрыда забіта 907 чалавек, ранена 2.809, з якіх 370 памерлі. Прапаўшых без весткі—430. У рабочых прадмесцях Тэтуан і Вальекас забіта 214 чалавек, ранена 693.

Заява Мусаліні

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 19 сакавіка. (БЕЛТА). У гутарцы з спецыяльным карэспандэнтам кансерватыўнай газеты «Дэйлі мейль» Уорлам Прайсам Мусаліні, закранаючы падзеі ў Іспаніі, заявіў:

«Італьянскія добраахвотнікі, колькасць якіх значна перавялічана, вернуцца дамоў, калі гэта ім будзе зручна, калі не будзе дасягнута агульнае пагадненне адносна адклікання добраахвотнікаў іншых краін з Іспаніі. Пасля вайны Італія не мае намераў умешвацца ў іспанскія справы».

Паездка Шушніга ў Будапешт

ВЕНА (сталіца Аўстрыі), 19 сакавіка. (БЕЛТА). Учора ў Будапешт (сталіца Венгрыі) прыбыў аўстрыйскі канцлер (глава ўрада) Шушніг у суправаджэнні дырэктара аўстрыйскага тэлеграфнага агенцтва і інш. Па прыездзе Шушніг быў прынят рэгентам (кіраўніком) Венгрыі Хорці і раіўся з венгерскім прэм'ерам Дараньі.

Паездка Шушніга ў Будапешт афіцыяльна тлумачыцца як адказ на нядаўні візіт у Вену венгерскага прэм'ера Дараньі. Аднак, у венскіх палітычных колах прыдаюць вялікае палітычнае значэнне паездцы Шушніга. У гэтых колах сцвярджаюць, што галоўнай тэмай аўстра-венгерскіх перагавораў будзе служыць налыходзячая паездка Шушніга ў Рым (сталіца Італіі) для абмеркавання пытання аб рэстаўрацыі дынастыі Габсбургаў у Аўстрыі, а таксама пытанне аб адносінах Аўстрыі і Венгрыі да Чэхаславакіі.

НА КАНФЕРЭНЦЫІ ДАПАМОГІ... САБАТАЖУ

(Канферэнцыя па іспанскаму пытанню, скліканая II і Амстэрдамскім інтэрнацыяналамі).

Малюнак Я. Кашкеля.



НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Паспешнае адступленне італьянскіх войск

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 сакавіка. (БЕЛТА). Учора старшыня камітэта абароны Мадрыда генерал Міяха ў гутарцы з журналістамі заявіў: мяцежнікі ўзарвалі мост Масегосо, які яны планавалі пабудаваць у часе свайго наступлення ў бок Гвадалахары. Нашы войскі прадаўжаюць прасоўванне. Займаемыя нашымі войскамі пазіцыі хутка ўмацоўваюцца.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, усе вышыні даліны Тахуньі, размешчаныя каля Бруэгі, заняты рэспубліканскімі войскамі. Прадаўжаючы прасоўванне, рэспубліканцы ўчора ўвечары ўступілі ў Навальпотро (за 27 км. на паўночны ўсход ад Брыуэгі).

***

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 20 сакавіка. (БЕЛТА). Наступленне рэспубліканскіх войск на гвадалахарскім фронце прадаўжаецца. Перадавыя часці дасягнулі 94-га кіламетра па арагонскаму шасе. Праціўнік ухіляецца ад бою і ў паспешным адступленні пакідае на месцы шмат боепрыпасаў. Дэмаралізацыя італьянскіх часцей, якая выражаецца ў бегстве і здачы салдат, прадаўжаецца.

Газеты паведамляюць, што ў ноч на 19 сакавіка на гвадалахарскім фронце на рэспубліканскія лініі з'явіліся два італьянскіх сяржанты ў поўным узбраенні, перадалі рэспубліканцам надзвычай важныя дакументы, паведамілі каштоўныя весткі. Яны пацвердзілі, што сіла супраціўлення іспанскай народнай арміі прыводзіць італьянскіх інтэрвентаў у здзіўленне і выклікае сярод іх замяшанне.

Прывітанне Ларго Кабальеро

Глава ўрада Ларго Кабальеро адправіў генералу Міяхе тэлеграму:

«Зноў віншую сухаземныя і паветраныя сілы войск цэнтральнага фронта з бліскучай аперацыяй, якая скончылася поўным паражэннем італьянскай інтэрвенцыйнай арміі і заняццем плацдарма Брыуэгі. Ад імя ўрада прашу вас перадаць гераічным байцам адзін пароль: «Наперад, наперад!».

ТРАЦКІСТЫ—ВОРАГІ КІТАЙСКАГА НАРОДУ

Кітайскі журнал «Сіньсюэшы» («Новы спяг») апублікаваў у нумары ад 20 лютага 1937 года артыкул, прысвечаны працэсу антысовецкага трацкісцкага цэнтра.

Журнал падкрэслівае, што працэс мае вялікае значэнне не толькі для СССР, але і для ўсяго свету.

Ліквідацыя трацкісцкага цэнтра, — піша журнал, — яшчэ больш умацавала СССР. Совецкі Саюз з'яўляецца ў даны момант асноўнай сілай, якая вядзе палітыку міру і арганізуе супраціўленне агрэсарам. Выкрыццё трацкісцкай змовы нанесла моцны ўдар дзяржавам-агрэсарам, якія рыхтуюць напад на Совецкі Саюз. На працэсе было таксама даказана, што трацкісты сталі сапраўднымі рабамі імперыялістаў. Яны намерваліся зрабіць замах на самую прагрэсіўную дзяржаву ў свеце.

Ёсць яшчэ адзін пункт, які заслугоўвае асаблівай увагі, гаворыцца ў журнале, — гэта тое, што трацкісты з'яўляюцца ворагамі вызваленчага руху кітайскага народу. «Не перашкаджаць Японіі весці агрэсію ў Кітаі», — было адным з пунктаў іх праграмы. «Такім чынам, — заканчвае артыкул, — выкрыццём змовы трацкістаў знішчан адзін з злейшых ворагаў справы вызвалення кітайскага народу».

У заключэнне журнал указвае, што кітайскі народ павінен улічыць урокі працэса антысовецкага трацкісцкага цэнтра і прыняць самыя рашучыя меры для выкарэнення змоўшчыкаў і мяжнікаў у Кітаі.

(Уг. інф. «Праўды»).

ДА ФАШЫСЦКАЙ ПРАВАКАЦЫІ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 18 сакавіка. (БЕЛТА) Як паведамляе агенцтва Гавас, сёння раніцой делегацыя левых партый была прынята главой французскага ўрада Леонам Блюмам. У часе гутаркі прысутнічаў таксама міністр унутраных спраў Дормуа.

Пасля сканчэння гутаркі прадстаўнік компартыі Жак Дзюкло заявіў:

«З адбыўшыхся перагавораў відаць наяўнасць агульнай волі да таго, каб захаваць больш згуртаваны, чым калі-небудзь, народны фронт».

Паводле слоў агенцтва, у перагаворах былі закрануты магчымыя водгукі парламента на падзеі ў Кліпы.

КЛОПАТЫ АБ МАЦІ І ДЗІЦЯЦІ

На віцебскай фабрыцы «КІМ» сёлета кожны дзень у сярэднім знаходзіцца ў адпачынку па цяжарнасці 234 работніцы — гэта на 77 проц. больш леташняга.

Кожны дзень з дакратыўнага адпачынку прыходзяць дзесяткі жанчын з маленькімі грамадзянамі на руках. Яны нясуць іх у фабрычныя яслі, дзе сёстры і ўрачы акружаюць маленькіх дзяцей матарынскімі клопатамі.

Прасторна, шмат паветра і сонца ў фабрычных яслях, якія размясціліся ў двухпавярховым будынку. Тут знаходзіцца 250 дзяцей, 80 з іх жывуць у яслях ад выходнага да выходнага дня. Пры фабрыцы ёсць два дзіцячыя сады на 180 месц. Зараз заканчваецца будаўніцтва новага сада на 125 дзяцей. Да лета работніцы атрымаюць новыя яслі на 250 дзяцей. Летам выхаванцы дзіцячага сада і ясляў выедуць на дачу.

КАЛГАСНЫЯ ХАТЫ-ЛАБАРАТОРЫІ

Хата-лабараторыя калгаса «Рассвет» Жлобінскага раёна сваімі дасягненнямі і вопытам шмат дапамагла калгаснікам атрымаць у мінулым засушлівым годзе высокі ўраджай. У сёлетнюю вясну колькасць калгасных хат-лабараторый у рэйне будзе даведзена да 15. У першую чаргу яны будуць абсталяваны ў буйнейшых калгасах: імя Кірава, «Вольная праца», імя Косарэва, «Новае жыццё» і інш. Зімой праведзены курсы па падрыхтоўцы загадчыкаў хат-лабараторый, якія скончыла 9 чалавек.

137 МАЛАДЫХ ЦЯЖКААТЛЁТАЎ

У Менску скончыліся гарадскія спаборніцтвы маладых гіравікоў і барцоў. У іх прымала ўдзел небывалая колькасць атлётаў — 137 чалавек. Цікава адзначыць, што адных барцоў было 92, толькі ў поўлёгкай вазе першынства аспрачвала 21 барэц. Маладыя цяжкаатлёты паказалі высокую тэхніку ў падняцці цяжараў і ў французскай барацьбе. Першае месца па штанзе заняла каманда тэхнікума фізкультуры, на другім месцы каманда АБВШ імя Калініна. Па французскай барацьбе перамогу атрымала каманда політэхнічнага інстытута, на другім месцы каманда Дома Чырвонай Арміі. Асабліва вызначыліся барцы Ачкін, Батурын, Граф, Яськоў, Зубаў, штангісты Кавалёў і Сямёнаў.

ЗАКОНЧЫЛІСЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА ПЛАВАННЮ

19 сакавіка ў басейне менскага Дома Чырвонай Арміі імя маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава закончыўся 12-дзённы збор-спаборніцтва плаўцоў Беларускай ваеннай акругі. 50 лепшых па дасягненнях плаўцоў акругі ўдасканальваліся ў плаванні і рыхтаваліся стаць кваліфікаванымі інструктарамі і трэнерамі па плаванню для работы ў часцях акругі на летні перыяд.

Зборы закончыліся вялікімі двухдзённымі спаборніцтвамі, на якіх устаноўлена 1 новае ўсесаюзнае дасягненне, 11 новых дасягненняў РСФА і 27 новых дасягненняў БВА і БССР. Чырвонаармеец Менскага гарнізона т. Сямёнаў праплыў пад вадой 50 метраў за 32,9 секунды, гэта на 0,3 сек. вышэй усесаюзнага рэкорда.

Выдатныя ўмовы басейна і добры трэнерскі склад менскага Дома Чырвонай Арміі забяспечылі добрыя дасягненні ўсіх удзельнікаў збора і далі вялікую колькасць новых рэкордаў па плаванню, гэтым самым паставіўшы Беларускую ваенную акругу па дасягненнях на адно з першых месц у РСФА.

КАМЕНСКІ.

ЗДАБЫТКІ ПАЛЯЎНІЧЫХ

З поспехам закончылі зімовы сезон паляўнічыя Магілеўшчыны. За сезон забіта 10 ваўкоў, 8 барсукоў, многа зайцаў і лісіц і шмат іншага пушнога звера. На загатоўчы пункт здана пушніны на 37.189 руб. супроць 25 тыс. па плану. Лепшыя паляўнічыя Магілеўшчыны Міронаў, Іванькоў і Куксенкаў здалі пушніны на 800 руб. кожны.

***

Сёлетняй зімой у лясах беларускага дзяржаўнага запаведніка забіта 7 рысяў. З трох скур зроблены чучалы для музеяў. За 12 год існавання запаведніка ўпершыню удалося забіць столькі рысяў. Рысь з'яўляецца шкодным драпежным зверам як для жыхароў лесу, так і для хатняй жывёлы.

РЭСТАРАН У ТУРАВЕ

У раённым цэнтры Тураве адкрыўся рэстаран. Рэстаран па-мастацку афарплен. На яго абсталяванне выдаткавана 25.000 рублёў.

В. ХАЧЫНСКІ.

ДЗЕ ПРЭМІІ?

У 1936 годзе Беларускі совет спартыўнага таварыства «Спартак» за добрыя паказальнікі ў спаборніцтвах прэміраваў рад магілеўскіх фізкультурнікаў рознымі каштоўнымі падарункамі (гадзіннікамі, патэфонамі). У ліку прэміраваных былі рэкардсменка па бегу Кароткіна З., рэкардсмен Арлоўскі, Галубева Т. і інш.

З моманту рашэння совета «Спартака» аб прэміраванні прайшоў ужо цэлы год. Але фізкультурнікі чамусьці да гэтага часу не атрымалі сваіх прэмій.

ДЗЕРНОЎСКІ.

ВЯСНА

ГОМЕЛЬ, 19 сакавіка. (БЕЛТА). З кожным днём усё больш адчуваецца прыход вясны. На вуліцах бягуць апошнія ручаінкі вады ад расталага снегу. Пачуўся першы спеў жаваранка. Прыступлена да абрэзкі дрэў на вуліцах горада. Ажывілася работа ў парку імя Луначарскага.

Парк імя Луначарскага будзе месцам сапраўднага культурнага адпачынку для працоўных. Зімою значна пашырана паркавая сажалка, якая хутка запоўніцца вадой. Сажалку заселяць лебедзі і розная рыба. Навокал сажалкі будуць зроблены дарожкі і клумбы, пастаўлены лаўкі.

Прыгожыя кветкавыя клумбы і дарожкі будуць разбіты вакол фантана насупроць Дома партактыва, які знаходзіцца ў былым палацы князя Паскевіча. На тэрыторыі парка будзе высаджана больш 25 тыс. кветак. Упершыню сёлета зімой пасаджана 10 дрэў ліпы. З наступленнем больш цёплага надвор'я на алеях будуць расстаўлены прыгожыя дэкаратыўныя расліны, якія зараз знаходзяцца ў парнікавай аранжарэі.

Сёлета ў парку абсталёўваецца парашутная вышка і шмат розных спартыўных пляпоўак. Лодачная станцыя атрымае больш 150 новых лодак і некалькі парусных яхт. Чатыры мотакацеры будуць перавозіць адпачываючых праз раку Сож на пляж і да Пролетарскага луга, які знаходзіцца за 4 кіламетры ад горада.

У верхняй частцы парка пабудован гукавы кінатэатр. З пачаткам сезона пачнуць працаваць чытальні, рэстаран, буфеты.

***

ЛЁЗНА, 19 сакавіка. Цёплае сонечнае надвор'е стаіць у апошнія дні ў раёне. Днём тэмпература дасягае 8 градусаў цеплыні. На полі не відаць снегу. Набухаюць почкі лазы і таполі. Прыляцелі граі і шпакі.

РАННЯЯ ГАРОДНІНА

Рабочыя саўгаса імя Кірава Чырвонаслабодскага раёна, пачынаючы з 15 лютага, маюць аялёную ранюю гародніну: цыбулю-пяро, а з 20 сакавіка маюць радыску, шпінат, укроп і часнок. Да 1 мая будуць гуркі. Усё гэта вырашчана ў поўцёплых парніках саўгаса. Пры належнай пастаноўцы работы па агародніцтву саўгасы і калгасы Чырвонаслабодскага раёна маюць усе магчымасці мець ранюю гародніну. Але райгас не ўдзяляе дастатковага ўвагі арганізацыі ў калгасах парніковых гаспадарак.

Садоўнік-гароднік саўгаса імя Кірава АКІНЧЫЦ.

Ад Бялыніцкага РК КП(б)Б

Згублены партыйны білет узору 1936 года, выданы Бялыніцкім РК КП(б)Б на імя Сідаровіча Фёдара Герасімавіча за № 0860525, лічыць несапраўдным.

Нам. сакратара РК КП(б)Б ЭЛЬКІНА.

Ад Сталінскага РК КП(б)Б

Сталінскі РК КП(б)Б выклікае ў райком тав. Балатніцкага Сцяпана Якаўлевіча.

Дзеннік

— Семінар рэдактароў шматтыражак і насценных газет адбудзецца 21 сакавіка ў 6 гадзін вечара ў 21 пакоі Дома партактыва.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
АПОШНІЯ
Абанемент № 62.

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДАРЫКО

Дзіцячы гукавы кінатэатр
ЮНАЦТВА ПАЭТА

Гукавы кінатэатр «Пролетарый»
АПОШНЯЯ НОЧ

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ШУКАЛЬНІКІ ШЧАСЦЯ

Гукавы кінатэатр «Спартак»
«КАЗНЬ»

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 22 САКАВІКА:

8.30—«Апошнія паведамленні». 16.00 — канцэрт; 17.00 — перадача для дзяцей; 18.30 — літаратурная перадача на яўрэйскай мове. 19.45 — канцэрт. 20.00 — гутарка. 20.15 — канцэрт. 20.30 — завочная партвучоба. 21.45 — канцэрт артыстаў оперы. 23.00 — «Апошнія паведамленні».

ЗГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ:

СІТКЕВІЧ А. В. — пашпарт; ГАНЧАРОЎ Н. А. — пашпарт і ваенны білет; ГУРЭНЧЫК О. В. — пропуск на пошту; АНДРЫЕЎСКІ П. С. — пашпарт; БОРТНІК Л. — пашпарт; ваенны білет; ДЗЕМЯНОВІЧ Ф. І. — метрыка; ЯНОВІЧ В. М. — прафбілет № 149144; САКАЛОЎСКАЯ В. М.—пашпарт № 85015, комсамольскі білет № 4923905; ЗДАРАЎЦОЎ А. П. — ваенны білет; МАЛЬЦАВА Н. І. — заведка аб нованароджаным; РАХЛЕНКА Б. В. — комсамольскі білет № 4894785.

Уп. Галоўлітбела № К—694.

ЛЕКТОРЫЙ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ
(Комсамольская, 25. Тэл. 21.727, 24.788)

У сакавіку будзе прачытан ЦЫКЛ ЛЕКЦЫЙ ПА НАВУЦЫ І ТЭХНІЦЫ

23 сакавіка — Фотаэлементы і іх прымяненне. Чытае праф. Е. В. СНЕТКОЎ.

24 сакавіка — Зававанне марскіх глыбінь. Чытае пам. нач. навукова-даследчага аддзела Галоўнага кіраўніцтва Эпрона, ваенінжынер 3-га ранга П. Г. Авоцін (Ленінград).

30 сакавіка — Совецкая Арктыка. Чытае вучоны сакратар інстытута геалогіі Беларускай акадэміі навук, інжынер-геолаг А. Н. Аўксеньеў.

Пачатак лекцый у 7 гадзін 30 мінут вечара. Абанементы і білеты прадаюцца ў канцылярыі Дома тэхнікі штодзённа з 2 да 4 гадзін дня (апрача дзён пасля агульных выходных), а таксама ў дні лекцый з 6 гадзін вечара.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на КРАСАВІК і наступныя месяцы 1937 г.
на выданні выдавецтва ЦК КП(б)Б „ЗВЯЗДА"

„ЗВЯЗДА"
орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 мес. — 2 руб. 50 кап., 3 мес.—7 руб. 50 кап., 6 мес. —15 руб., на 1 год — 30 руб.

„ОРКА"
польская газета, орган ЦК КП(б)Б
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 мес. — 1 руб. 20 кап., 3 мес. — 3 руб. 60 кап., 6 мес. — 7 р. 20 к. На год — 14 р. 40 к.

„РАУДАНАСІС АРТОЯС"
Усебеларуская літоўская газета, выданне ЦК КП(б)Б
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 мес. — 30 кап., 3 мес. — 90 кап., 6 мес. — 1 р. 80 к., на год — 3 руб. 60 кап.

„БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ"
Журнал партыйнага будаўніцтва, орган ЦК КП(б)Б
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 мес. — 40 кап., 3 мес. — 1 руб. 20 кап., 6 мес. — 2 руб. 40 к. на год — 4 руб. 80 к.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ"
2-тыднёвы журнал, выданне ЦК КП(б)Б
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 мес. — 40 кап., 3 мес. — 1 руб. 20 кап., 6 мес. — 2 руб. 40 кап. на год—4 руб. 80 к.

Падпіска прымаецца: канторай выдавецтва «Звязда», Менск, Совецкая, 83; Саюздрукам, усімі паштовымі аддзяленнямі агенцтвамі і пісьманосцамі.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б «ЗВЯЗДА».

ПАСТАНОВА
Менскага гарадскога фінансавага аддзела
ад 17 сакавіка 1937 г.

Праверкай устаноўлена, што кіраўнікі асобных прадпрыемстваў і ўстаноў не перавялі своечасова і поўнасцю падаходны падатак і культзбор, утрыманыя з зарплаты рабочых і служачых (завод імя Мяснікова—нач. завода т. Дзічкоўскі, гал. бухгалтар т. Заборскі; Дом Чырвонай Арміі — гал. бухгалтар т. Дзенбнавіцкі; завод «Чырвоная зара» — дырэктар т. Гурэвіч, гал. бухгалтар т. Элькінд), што з'яўляецца прамым парушэннем закона аб падаходным падатку і культзборы, бо гэтыя сумы павінны пераводзіцца поўнасцю і адначасова з атрыманнем з банка сум на зарплату.

На падставе вышэйуказанага Менгарфа ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Давесці да ведама арганізацый, якім падпарадкаваны вышэйпамянёныя прадпрыемствы, аб накладанні дысцыплінарнага спагнання на кіраўнікоў і галоўных бухгалтароў указаных прадпрыемстваў.

Адначасова прапанаваць кіраўнікам і галоўным бухгалтарам устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый г. Менска ў бліжэйшыя дні праверыць і ліквідаваць усю запазычанасць па падаходнаму падатку і культзбору, калі такая ёсць, і папярэдзіць, што пры выяўленні запазычанасці у адносінах віноўных будуць прыняты самыя жорсткія меры.

Нам заг. Менгарфа ЭЙДЭЛЬШТЭЙН.
Ст. падатковы інспектар ДЗІМЕНТ.

ЗАГАД № 435
ПА НАРОДНАМУ КАМІСАРЫЯТУ АСВЕТЫ БССР

16 сакавіка 1937 г. г. Менск.

У сувязі з правядзеннем у часе веснавога школьнага перапынку настаўніцкіх канферэнцый прапаную змяніць парадак вызначаных на гэты час сесій завочнікаў наступным чынам:

1. Для завочнікаў педагагічных тэхнікумаў скараціць працяг да 3-х дзён і праводзіць яе на кансультацыйных пунктах пасля сканчэння канферэнцыі.

2. Веснавую сесію завочнікаў педагагічных інстытутаў адмяніць.

Нарком Асветы БССР ДЗЯКАЎ.

ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ!
БЕЛБРОДТРЭСТ
— НАРКАМХАРЧПРОМА БССР —
на пачу вул. КОМСАМОЛЬСКАЯ і НЯМІГІ, д. № 1/13
АДКРЫТ УЗОРНЫ МАГАЗІН
ПА ПРОДАЖУ
ГАЗІРАВАНЫХ ФРУКТОВА-ЯГАДНЫХ НАПІТКАЎ, СОКАЎ, ПЛОДА-ЯГАДНЫХ ВІН, ДЖЭМА, ДРОЖДЖАЎ, ПІВА і інш.
прадукцыі заводаў трэста.
У МАГАЗІНЕ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ
ВЯЛІКІ ВЫБАР
РОЗНАСТАЙНЫХ ПА СМАКУ, ВЫСОКАЯКАСНЫХ НАТУРАЛЬНЫХ
СІРОПАЎ.
НАТУРАЛЬНЫЯ СІРОПЫ, з насычанай газіраванай вадой даюць напітак ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ.
БЕЛБРОДТРЭСТ.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 6.

К., К., С.